Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 83 (6059) | 11 красавіка 1938 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Перадавы артыкул з «Правды» — Любоў да радзімы і пролетарскі інтэрнацыяналізм.

Перадмайскае спаборніцтва на фабрыках і заводах БССР.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ.

Пленум Менгаркома КП(б)Б.

А. К. Лапацін. — Умацоўваем сувязь з масамі.

М. Н. Пугач. — Крытыкавалі не зважаючы на асобы.

Г. Вярхоўскі. — Справаздачны даклад падрыхтаван наспех.

АРТЫКУЛЫ:

І Турацкі. — На ўздыме.

С. Розум. — Хата-лабараторыя.

І. Карандзей. — Абавязацельствы ляжалі ў шафе сельсовета.

М. Кін. — Дом народнай творчасці без... дома.

Н. Г. — Больш увагі мастакам-самавучкам.

БІБЛІЯГРАФІЯ:

«Навука ў тупіку».

ЗА РУБЯЖОМ:

— Выступленне Чэмберлена ў Бірмінгаме.

Урадавы крызіс у Францыі. — Паведамленне Палітбюро французскай компартыі. — Соцыялісты адмовіліся ўвайсці ва ўрад. — Правакацыйныя манеўры французскіх капіталістаў. — Новы французскі ўрад.

На франтах у Іспаніі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі. — Паступленне кітайскіх войск у Шаньдуне.

СОВЕЦКІ ГАНДАЛЬ—НА УЗРОВЕНЬ УЗРОСШЫХ ЗАПАТРАБАВАННЯЎ ПРАЦОЎНЫХ!

Пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі квітнее і мацнее Совецкая Беларусь — адна з шчаслівых і роўнапраўных рэспублік вялікага Совецкага Саюза. З кожным днём усё больш павышаецца добрабыт беларускага народа, павялічваюцца яго матэрыяльныя багацці, яго соцыялістычныя накапленні. І разам з гэтым растуць з кожным днём матэрыяльныя і культурныя запатрабаванні працоўных.

Няма больш ганаровай задачы, чым задавальненне гэтых запатрабаванняў, чым штодзённая барацьба за ўсеагульны добрабыт народа, за радасць для ўсіх працоўных. Так вучыць нас партыя, так вучыць нас вялікі Сталін.

Адным з важнейшых вагароў задавалення патрэб насельніцтва з'яўляецца совецкі гандаль. Можна колькі хочаш павялічваць выраб прамысловых тавараў і сельскагаспадарчых прадуктаў, але без культурнага совецкага гандлю, без разгорнутага тавараабароту яны не трапяць да спажыўца. «Неабходна, каб краіна была пакрыта багатай сеткай гандлёвых баз, магазінаў, крам. Неабходна, каб па каналах гэтых баз, магазінаў, крам безупынна цыркулявалі тавары ад месц вытворчасці да спажыўца» (**Сталін**).

Нязмерна вырасла ў нашай краіне гандлёвая сетка, нязмерна выраслі і растуць з кожным годам размеры тавараабароту.

І ўсё-ж гандлёвая сістэма значна адстае ад запатрабаванняў мас насельніцтва, не спраўляецца са сваёй адказнейшай задачай — абслугоўваць штодзённыя патрэбы народа.

Подлыя трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія агенты германа-японскага і польскага фашызма прыкладалі ўсе сілы, каб сарваць нармальнае снабжэнне насельніцтва самымі неабходнымі таварамі і прадуктамі. Яны свядома заблытвалі планы тавараабароту, арганізоўвалі сустрэчныя перавозкі тавараў, культывавалі растраты і крадзеж дзяржаўных і кааператыўных сродкаў, рабілі дастатковыя тавары і прадукты вострадэфіцытнымі, псавалі тавары. Дыверсанты і шкоднікі ўсяляк цкавалі чэсных работнікаў совецкага гандлю, выжывалі іх з гандлёвага апарату, насаджаючы на іх месцы сваіх пасобнікаў.

Нашы слаўныя органы НКВД на чале з любімым сталінскім наркомам Н. І. Ежовым выкрылі і абезшкодзілі заклятых ворагаў народа. Жалезнай мятлой вымецена і вымятаецца з гандлёвага апарата ўсё варожае ахвосце, уся фашысцкая погань. На кіруючую работу ў гандлёвую сістэму вылучаны новыя маладыя совецкія кадры, сапраўды адданыя справе партыі Леніна—Сталіна, справе соцыялізма.

Але ліквідацыя рэшткаў шкодніцтва фашысцкіх шпіёнаў і дыверсантаў, перабудова работы гандлёвага апарата праходзіць недапушчальна марудна. Аб гэтым сведчыць безліч фактаў. Варта прайсці хоць-бы па магазінах Менска. Тут можна ўбачыць няўмелае і некультурнае абслугоўванне пакупнікоў, напляваецельскія адносіны да іх інтарэсаў. Колькі разоў падымалася, напрыклад, пытанне аб папярэдняй фасоўцы тавараў, колькі прыгожых рэзалюцый напісана па гэтаму поваду! Але далей пустых дэкларацый справа не пайшла. У асобных магазінах на працягу кароткага часу практыкавалі папярэднюю фасоўку, а потым чамусьці супынілі, хаця наглядна бачылі, якія велізарныя выгады яна дае пакупніку.

Тое-ж самае і з арганізацыяй прыёму папярэдніх заказаў і дастаўкі тавараў на дом. Вельмі мала такіх магазінаў, дзе захаваўся яшчэ гэты парадак, вызваляючы пакупніка ад неабходнасці траціць час у чарзе і аблягчаючы яму дастаўку купленага тавару. Толькі коснасцю і непаваротлівасцю гандлёвых работнікаў можна вытлумачыць ліквідацыю гэтых вельмі важных элементаў культурнага гандлю, якія трэба было-б максімальна пашыраць і ўкараняць!

Бруд, антысанітарыя, грубыя адносіны да пакупніка, абмерванне, абважванне яго, незаконнае павышэнне цэн на тавары — усё гэта яшчэ мае месца ў частцы магазінаў, крам, ларкоў. Не дарма кнігі скарг так стракацяць заявамі абураных спажыўцоў!

Але спажывец сутыкаецца непасрэдна толькі з загадчыкам магазіна, з работнікамі прылаўкаў. Між тым не адны яны нясуць адказнасць за шматлікія недахопы ў гандлі. У першую чаргу, віна падае, безумоўна, на кіруючыя гандлёвыя арганізацыі, пачынаючы ад Наркамгандлю БССР, Белпрамгандлю, Белхарчгандлю і Белкаапсаюза і канчаючы райспажыўсаюзамі і сельпо. Адсутнасць сапраўды дзелавога, сапраўды аператыўнага кіраўніцтва гэтых арганізацый сваімі нізавымі сістэмамі прыводзіць да буйнейшых прарываў.

Чаго патрабуе пакупнік ад кожнага магазіна і крамы? Шырокага і розна-стайнага асартыменту тавараў! Ці могуць гандлёвыя арганізацыі забяспечыць магазіны і крамы патрэбным асартыментам? Могуць і абавязаны! Наша соцыялістычная прамысловасць, наша калектывізаваная сельская гаспадарка вырабляюць і ў стане вырабляць яшчэ больш самых рознастайных тавараў і прадуктаў, неабходных совецкаму спажыўцу. І калі пакупнік не знаходзіць у краме таго, ці іншага прадмета, то гэта ёсць вынік непаваротлівасці і безініцыятыўнасці гандлёвых арганізацый, вынік іх нядобрасумленных адносін да сваіх непасрэдных абавязкаў.

У магазінах Белпрамгандлю ў Менску нельга знайсці, напрыклад, такіх тавараў, як самаварныя трубы, гумоўкі, шчоткі для мыцця падлогі і іншыя рэчы хатняга ўжытку. Чаму? Аказваецца, гэтыя тавары сталі «дэфіцытнымі» з-за коснасці самога Белпрамгандлю, які не знаходзіць патрэбным дагаварыцца з прамысловымі прадпрыемствамі аб вырабе гэтых простых рэчаў.

Або вось другі прыклад. У крамах многіх гарадоў і раёнаў БССР няма лямпавага шкла 7, 10 і 15 нумароў. У той-жа час Белшклозбыт прадаў 121 вагон гэтага шкла на вываз з БССР звыш усякіх фондаў і ў пазапланавым парадку. У чым-жа справа? А ў тым, што гандлёвыя арганізацыі не здолелі дагаварыцца з Белшклозбытам аб забеспячэнні рынка БССР лямпавым шклом патрэбных размераў.

У крамах сельпо Чэрвеньскага, Менскага і іншых раёнаў нельга знайсці табурэтаў. Белкаапсаюз спасылаецца на тое, што, моў, гэтыя прадметы не вырабляюцца. А вось склад дрэваапрацоўчай арцелі «1 Мая» ў Смілавіцкім раёне завален табурэтамі, якія чакаюць рэалізацыі. Справа, такім чынам, не ў адсутнасці табурэтаў, а ў адсутнасці гібкасці ў Белкаапсаюза і яго сістэмы.

Толькі злачыннай бестурботнасцю, адсутнасцю клопатаў аб спажыўцу тлумачыцца тое, што ў многіх крамах Віцебскага, Полацкага, Даманавіцкага, Мазырскага, Гомельскага, Аршанскага і іншых раёнаў маюць месца перабоі ў гандлі соллю, запалкамі, кандзіперскімі вырабамі, шклянкамі, талеркамі, замкамі, лямпамі, зубнымі шчоткамі, гузікамі і т. д. Так гандлёвыя арганізацыі гэтых раёнаў «падрыхтаваліся» да веснавой сяўбы.

Дагэтуль яшчэ не ліквідаваны сустрэчныя перавозкі тавараў. З Магілева, напрыклад, вывозяцца ў іншыя вобласці СССР ложкі, а гандлёвыя арганізацыі БССР завозяць такія-ж ложкі з іншых рэспублік Саюза. Магілеўская люстэркавая фабрыка прадае сваю прадукцыю на Украіне, а Магілеўская кантора Белпрамгандлю завозіць потым гэтыя-ж люстэркі з УССР. У Барысаве, як вядома, ёсць макаронная фабрыка, а барысаўская кантора Белпрамгандлю закупляе макароны ў... Віцебску. Тое-ж самае і з венскімі крэсламі, якія вырабляюцца ў Барысаве. Наркамгандаль БССР ведае аб усіх гэтых бясчынствах, але канкрэтных мер для знішчэння іх не прымае.

Усе гэтыя факты—яркае сведчанне таго, што гандлёвыя арганізацыі БССР не мабілізаваліся яшчэ па-сапраўднаму на ліквідацыю рэшткаў шкодніцтва, не ўзяліся за навядзенне большэвіцкага парадку ў гандлі. Ужо час узяцца за гэту справу, таварышы гандлёвыя работнікі! Вы павінны памятаць, што служыце вялікаму совецкаму народу, што партыя і ўрад даверылі вам важнейшы ўчастак соцыялістычнага будаўніцтва.

Наша рэспубліка ўступіла ў паласу веснавой сяўбы і рыхтуецца зараз да першамайскага свята і да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Справа гонару ўсіх гандлёвых работнікаў БССР — адзначыць падрыхтоўку да гэтых велізарных падзей карэнным паляпшэннем сваёй работы, радняцем совецкага гандлю на ўзровень узросшых запатрабаванняў шырокіх мас насельніцтва!

ДА ДЭКАДЫ АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ. 3 красавіка ў філіяле Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР (Масква) адбылася генеральная рэпетыцыя оперы «Кёр-Оглы» ў пастаноўцы Азербайджанскага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава. Музыка народнага артыста АзССР Узеіра Гаджыбекава. НА ЗДЫМКУ: сцена з 1 дзеі оперы «Кёр-Оглы». У ролі Гасанхана — заслужаны артыст Аз ССР М. Т. Багіраў, у ролі Ібрагімхана — артыст Б. А. Мустафаеў.

Фото З. Еўзерыхіна (СФ).

ДЭКАДА АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА МАСТАЦТВА ПРАХОДЗІЦЬ З ВЯЛІКІМ ПОСПЕХАМ

НА СПЕКТАКЛІ «АРШЫН МАЛ-АЛАН» ПРЫСУТНІЧАЛІ ТАВАРЫШЫ І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, М. Д. БАГІРАЎ

Азербайджанскі Дзяржаўны тэатр оперы і балета імя М. Ф. Ахундава паказаў вечарам 9 красавіка вясёлы дасціпны спектакль «Аршын Мал-Алан», пастаўлены галоўным рэжысёрам заслужаным артыстам АзССР Ісмаілам Ідаят-Задэ. Гэта папулярная музычная камедыя, напісаная кампазітарам Узеірам Гаджыбекавым яшчэ ў 1914 годзе, знаёміць масквічоў з раннім перыядам яго творчасці. Спектакль меў шумны поспех у гледачоў.

Заслужаныя артысты АзССР Бюль-Бюль, Г. А. Гаджыбабабекаў, артысткі Сона Мустафаева, Аля Тэрагулава і іншыя жыва правялі спектакль, поўны дасціпных сцэн.

Выдатна гучэў аркестр народных інструментаў пад упраўленнем дырыжора Сеіда Рустамава. Меладычная, сапраўды народная музыка, арганічна зліваючыся з дзеяннямі на сцэне, падкрэслівала нацыянальны каларыт спектакля. Агульнае ўражанне павялічвалі эфектныя дэкарацыі мастака Адхема Султанава.

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, М. Д. Багіраў.

Па сканчэнні спектакля ўсе гледачы наладзілі выканаўцам гарачую авацыю.

(БЕЛТА).

ПЕРАДМАЙСКАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ БССР

СПАБОРНІЦТВА НА ГОМЕЛЬСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ

ГОМЕЛЬ. (**По тэлефону**). Ініцыятыва сельмашаў падхоплена ўсімі прадпрыемствамі горада.

На станкабудаўнічым заводзе імя Кірава ўсе рабочыя буйнейшага механазборачнага цэха ўступілі ў соцыялістычнае спаборніцтва. Спаборнічаюць паміж сабой брыгады і змены.

За апошнія дні многія рабочыя ўзялі сваю прадукцыйнасць працы. Фрэзероўшчык тав. Хайкін 4 красавіка выканаў сваю норму на 205,7 проц., 5-га—на 255,8 проц. Токар тав. Зельманаў павысіў сваю выпрацоўку да 284 проц., токар Пазнякоў—да 222,8 проц.

Прыкладу перадавых стаханаўцаў следуюць і новыя рабочыя. Так, комсамолец Палятаеў 5 красавіка стаў выконваць сваю норму больш чым на 200 проц.

Расце прадукцыйнасць працы і на другім буйнейшым заводзе—паравозавагонарамонтным. Фрэзероўшчык рамонтнага цэха, комуніст тав. Рэванаў выконвае сваю норму на 336 проц., маляр вагоннага цэха комсамолец Кірухін—на 340 проц., абрубшчык старалітейнага цэха тав. Храмцоў — на 357 проц.

На заводзе «Рухавік рэволюцыі» ўпярадзе спаборнічаючых ідуць фармаўшчыкі Фармаўшчык тав. Патронаў выконвае сваю норму на 260 проц., тав. Чэрняк—на 211 проц., тав. Дзераўкін—на 224.

Г. ГАРЭЛІК.

РАСЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

Буйнейшыя прадпрыемствы Магілева — шоўкавая фабрыка, швейная імя Валадарскага, скурзавод імя Сталіна і іншыя ўключыліся па закліку гомельмашаўцаў у перадмайскае спаборніцтва.

Швейная фабрыка, выканаўшы праграму першага квартала на 103,3 проц., не паслабляе сваіх тэмпаў і ў красавіку. На 7 красавіка план выканан па фабрыцы на 102,6 проц. Перавыконваюць свае штодзённыя заданні ўсе цэхі.

У рэзультаце соцыялістычнага спаборніцтва асобныя адстаючыя брыгады, якія раней не выконвалі нормы, зараз выйшлі ў перадавыя. Так, брыгады фасонаў №№ 054 і 047 (інструктар Курбацкая) выконваюць план на 104—133 проц., брыгада фасона № 042 (інструктар тав. Сарасоцкая) павысіла выпрацоўку да 128,8 проц. Упершыню пачалі выконваць план на 105—106 проц. брыгады першага цэха тт. Кацурына і Ласапнёва.

Работніцы матальнага цэха шоўкавай фабрыкі ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па далейшаму павышэнню прадукцыйнасці працы, ліквідацыі браку і інш.

АДКАЗ СПРАВАІ

Уступіўшы ў соцспаборніцтва з заводам лампугоў Галля на лепшую падрыхтоўку да Першага мая, калектыў завода «Ударнік» з кожным днём павышае тэмпы сваёй работы. На 8 красавіка адзін з асноўных цэхаў прадпрыемства — вагі Фалько выканаў свой план на 127 проц.

Ва ўсіх цэхах разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне месячнага плана да 25 красавіка. Намечана падрыхтаваць да здачы на значок ПВХА 25 чалавек і павялічыць рады варашылаўскіх стралкоў на 15 чалавек. На прымацаваным выбарчым участку разгарнулі сваю работу 20 агітатараў.

Зараз на заводзе асвойваецца вытворчасць новай 10-тоннай аўтамабільнай вагі. Першы экземпляр такой вагі будзе выпушчан к першамайскім святам.

ХАРЧОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ПЕРАВЫКАНАЛА ПЛАН ПЕРШАГА КВАРТАЛА

У рапарце на імя таварышаў Сталіна, Молатава і Мікаяна нарком харчовай прамысловасці СССР тав. Гілінскі паведамляе, што прамысловасць, якая падпарадкоўваецца Наркамхарчпрому СССР, выпусціла ў першым квартале 1938 г. прадукцыі на 3.085.220 тысяч рублёў у нязменных цэнах 1926—27 г. План першага квартала выканан на 106,6 проц. У параўнанні з першым кварталам 1937 г. прадукцыя ўзрасла на 17,5 проц.

ЗАСЕЯНА 7.664,4 тыс. ГЕКТАРАЎ ЯРАВЫХ

На 5 красавіка па Саюзу засеяна 7.664,4 тыс. гектараў яравых культур. План веснавой сяўбы выканан на 9 проц. У мінулым годзе на гэта-ж чысло было засеяна 9,923 тыс. гектараў або 11 проц. да плана.

Калгасамі засеяна 6.932,4 тыс. гектараў і соўгасамі ўсіх сістэм—732 тыс. гектараў.

(БЕЛТА).

ВЫСТУПЛЕННЕ ЧЭМБЕРЛЕНА Ў БІРМІНГАМЕ

ЛОНДАН, 9 красавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамленню агенцтва Рэйтэр, прэм'ер Чэмберлен выступіў з прамоваю ў Бірмінгаме. Закранаючы англа-італьянскія перагаворы, Чэмберлен заявіў: «Нямнога цярпення, і пагадненне з Італіяй будзе заключана і апублікавана». Далей ён паўтарыў, што Англія мае абавязацельствы ў адносінах да Францыі і Бельгіі, але не жадае браць на сябе такія-ж абавязацельствы ў адносінах іншых краін. Тым не менш нельга сказаць, — заявіў Чэмберлен,— якія ўрады ў канчатковым выніку будуць упягнуты ў канфлікт у некаторым аддаленым куту Еўропы. «Некаторыя гавораць, — прадаўжаў Чэмберлен, — што калі Англія зойме больш рашучую пазіцыю, то гэтым самым яна папярэдзіць вайну. Аднак гэта была-б ігра, а я не жадаю ўступаць у такую ігру». Чэмберлен пацвердзіў таксама, што англійскі ўрад не адмаўляецца ад ідэі стварэння «больш шырокай і лепшай» Лігі нацый.

***

ПАРЫЖ, 9 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе газета «Эўр», міністр замежных спраў Італіі Чыано ў часе гутаркі з англійскім паслом лордам Пертам выказаў сумненне ў магчымасці для італьянскага ўрада, нават калі пераможа генерал Франко, адклікаць італьянскія войскі з Іспаніі. У якасці доваду Чыано высунуў меркаванне, што Франко не зможа вытрымаць націск рэспубліканскай авіяцыі. Апрача таго, Чыано заявіў, што Італія не лічыць магчымым адклікаць італьянскіх «спецыялістаў», якія заняты на розных іспанскіх прадпрыемствах.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Паводле паведамлення агенцтва Гавас, па ўсёй лініі ад Трэмпа (на поўнач ад Лерыды) да Тартосы (на міжземнаморскім узбярэжжы) атрымаўшыя падмацаванні рэспубліканскія войскі робяць энергічны адпор прасоўванню мяцежнікаў да Каталоніі. Толькі ў раёне паміж Марэлья і Мора дэ Ла Нуэва — уздоўж правага берага ракі Эбро — часцям мяцежнікаў удалося некалькі прасунуцца наперад. У сучасны момант лінія фронта стабілізавалася ўздоўж ракі Эбро; дарога на Валенсію свабодна. На ўзвышшах, размешчаных уздоўж узбярэжжа і ўмацаваных траншэямі, рэспубліканскія ўдарныя часці абараняюць подступы к мору. Наступленне калон мяцежнікаў замарудзілася.

Як паведамляе іспанскае міністэрства абароны, мяцежнікі, перайшоўшы правы бераг ракі Нагара, зрабілі разведку ў раёне вёскі Сорт. У раёне Трэмпа мяцежнікі зрабілі атаку на вёску Ісона, якая была імі занята. Аднак рэспубліканскія часці пасля контратакі зноў узялі Ісону. У раёне Вальібона мяцежнікі прасунуліся да вышынь Монсіакрэ і Турмел.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

У сектары Эстрамадуры (на паўднёвы захад ад Мадрыда) войскі мяцежнікаў пасля страт, панесеных імі ў апошнія дні, кінулі на лінію агню значныя масы ўзбраення і зрабілі атаку на вёску Караскальехо, вакол якой ідзе люты бой.

***

Французскае агенцтва Гавас паведамляе, што рэспубліканскія гідрасамалёты зрабілі 9 красавіка напад на фашысцкія падводныя лодкі, плаваўшыя ў водах Альмерыі. Гэтыя лодкі, як відаць, былі затоплены, бо гідрасамалёты ў далейшым не выявілі ў гэтай частцы мора ніякіх слядоў фашысцкіх падводных лодак.

УРАДАВЫ КРЫЗІС У ФРАНЦЫІ

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПАЛІТБЮРО ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 10 красавіка. (БЕЛТА). Газета «Юманітэ» публікуе паведамленне Палітбюро французскай комуністычнай партыі, у якім гаворыцца, што Палітбюро і бюро парламенцкай групы партыі, сабраўшыся на сумесным пасяджэнні 9 красавіка, абмеркавалі палітычнае становішча, якое стварылася ў рэзультаце ўрадавага крызісу. Палітбюро адзначае, што ўрад Блюма «склаў поўнамоцтвы, не паставіўшы пытання аб давер'і. Ён не прабаваў супрацўляцца, хаця канстытуцыя дае такую магчымасць, і прапоўныя масы патрабуюць супраціўлення».

«Палітбюро і бюро парламенцкай групы,—гаворыцца далей у паведамленні, — адзначаюць неабходнасць утварэння ўрада, паважаючага народную волю, захоўваючага інтарэсы прапоўнага насельніцтва Францыі, і поўнай рашучасці бязлітасна пакараць фашысцкіх змоўшчыкаў у Францыі — падпальшчыкаў грамадзянскай вайны. Урад павінен быць поўным рашучасці прыняць энергічныя меры супроць элементаў буйнай буржуазіі, якія дэзарганізуюць вытворчасць, правацыруюць соцыяльныя канфлікты і наносяць шкоду справе нацыянальнай абароны. Ён павінен быць урадам, які-б абараняў мір і не дапамагаў ні ўнутры, ні па-за краінаю антыфранцузскім інтрыгам міжнароднага фашызма і яго агентаў».

СОЦЫЯЛІСТЫ АДМОВІЛІСЯ ЎВАЙСЦІ ВА ЎРАД

ПАРЫЖ, 10 красавіка. (БЕЛТА). Нацыянальны совет соцыялістычнай партыі адхіліў зробленую соцыялістычнай партыі прапанову прыняць удзел ва ўрадзе Далад'е.

Выступіўшы на пасяджэнні Нацыянальнага совета былы прэм'ер Блюм прызнаў, што раней узначальваемы ім урад не абавязан быў, па канстытуцыі, уступаць сенату і меў у сваім распараджэнні сродкі барацьбы супроць яго пазіцыі. Для гэтага ўраду трэба было звярнуцца да рабочых мас краіны. Але Блюм не палічыў магчымым пайсці на гэта, бо, па яго словах, «пры сучасным становішчы Францыі і Еўропы гэта паставіла-б Францыю пад рызыку авантуры». «Ідэя стварэння ўрада нацыянальнага яднання вакол народнага фронта, — заявіў Блюм, — неміну та будзе рана ці позна ажыццёўлена. Аднак тое, што соцыялістам прапануюць зараз, не з'яўляецца ні ўрадам па дакладнаму падабенству народнага фронта, ні ўрадам нацыянальнага яднання вакол народнага фронта».

НОВЫ ФРАНЦУЗСКІ ЎРАД

ПАРЫЖ, 10 красавіка. (БЕЛТА). Далад'е стварыў новы французскі ўрад у наступным складзе:

Старшыня совета міністраў і міністр нацыянальнай абароны — Эдуард Далад'е (радыкал-соцыяліст); віцэ-старшыня совета міністраў і міністр па каардынацыі ўрадавых дзеянняў—Шатан (радыкал); міністр юстыцыі — Поль Рэйно (левы рэспубліканец); міністр авіяцыі — Гі ля Шамбр (радыкал-соцыяліст); міністр фінансаў — Маршандо (радыкал); марскі міністр — Кампінкі (радыкал-соцыяліст); міністр народнай асветы—Жан Зей (радыкал-соцыяліст); міністр унутраных спраў—Альбер Саро (радыкал); міністр замежных спраў — Жорж Бонэ (радыкал); міністр калоній — Мандэль (група незалежных рэспубліканцаў) і інш.

У склад новага ўрада ўвайшлі ў большасці радыкалы і радыкал-соцыялісты. Соцыялісты, як вядома, адмовіліся ўвайсці ў склад урада Далад'е.

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ МАНЕЎРЫ ФРАНЦУЗСКІХ КАПІТАЛІСТАЎ

ПАРЫЖ, 9 красавіка. (БЕЛТА). Арганізацыі прадпрыемцаў машынабудаўнічай прамысловасці Парыжскага раёна накіравалі міністру працы пісьмо з адмаўленнем аднавіць перагаворы, пакуль прадпрыемствы будуць заняты бастуючымі, і павысіць зарплату. У адказ на гэты правакацыйны выклік абвясцілі забастоўку 4.500 рабочых парыжскіх заводаў «Іспана-Сюіза», 1.050 рабочых генеральнай будаўнічай кампаніі ў Сэн-Дэні, 900 рабочых аўтамабільных заводаў у Жэнвіллі (ваколіца Парыжа) і сотні рабочых дробных прадпрыемстваў. Агульная колькасць стачачнікаў, якія занялі прадпрыемствы, складае, прыкладна, 60 тысяч чалавек.

Бюро Усеагульнай канфедэрацыі працы выпусціла адозву, у якой усклада на прадпрыемцаў адказнасць за адбываючуюся забастоўку.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

НАСТУПЛЕННЕ КІТАЙСКІХ ВОЙСК У ШАНЬДУНЕ

ЛОНДАН, 9 красавіка (БЕЛТА) Як перадае агенцтва Рэйтэр, кітайскае камандаванне паведаміла, што кітайскія войскі ўвайшлі ў прадмесце Цзінані (сталіца правінцыі Шаньдун) і вядуць баі на вуліцах. Кітайскія войскі, якія дзейнічаюць гут, складаюць частку групы, фарсіраваўшай два тыдні назад Вялікі канал. Другая частка групы накіравалася на поўдзень для ўдару па тылах японскіх войск, якія вядуць баі пад Сюйчжоу.

***

ХАНЬКО�У, 9 красавіка. (БЕЛТА). У правінцыі Шаньдун 8 красавіка кітайскія войскі занялі Цзаочжуан (на паўночны захад ад Ісяна). У горадзе быў захоплен штаб японскага палка. 2 тысячы салдат, што асталіся ад разбітай дывізіі Ітагакі, прабавалі прарвацца праз кальцо кітайскіх войск. Аднак у баі палова з іх была знішчана.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

НА ПЛЕНУМЕ МЕНСКАГА ГАРКОМА ПАРТЫІ

Учора ў зале Дома партыйнага актыва пачаў сваю работу пленум Менскага гаркома партыі. У парадку дня наступныя пытанні: выкананне партарганізацыяй рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) і падрыхтоўка да выбараў кіруючых партыйных органаў; аб задачах партарганізацый у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет БССР і арганізацыйныя пытанні.

Даклад па першаму пытанню зрабіў в. а. сакратара гаркома партыі тав. Матвееў. Дакладчык расказаў пленуму, як ворагі народа, арудаваўшыя ў кіраўніцтве гаркома і горрайкомаў партыі, выключалі з партыі чэсных комуністаў. Тав. Матвееў прыводзіць факты, як ворагі народа актыўных комуністаў ператварылі ў «пасіў», «баласт» і пачкамі выключалі з радоў партыі. Толькі на адным пасяджэнні бюро гаркома (11 студзеня 1936 года) было выключана 74 чал.

У перыяд абмену і праверкі партыйных дакументаў за 1937 год па гораду было выключана з партыі толькі па матывах пасіўнасці 270 комуністаў і за малазначныя праступкі — 397. Пасля рашэння Пленума ЦК ВКП(б) гаркомам і райкомамі разгледжаны 834 апеляцыі. Адноўлена ў партыі 330 чалавек; асталося неразгледжанымі 38 апеляцый.

Дакладчык расказаў пленуму аб гнуснай дзейнасці паклёпнікаў, комуністаў-кар'ерыстаў, якія зараз выкрыты партарганізацыямі. У партыйнай арганізацыі трампарка арудваў паклёпнік Юркевіч. Ён падаваў хлуслівыя заявы на дзесяткі комуністаў. Варашылаўскі горрайком выключыў яго з партыі. Тады ён пачаў узводзіць паклёпы на членаў бюро райкома. Калі-ж больш уважліва заняліся праверкай, што з сябе ўяўляе Юркевіч, аказалася, што ён крымінальны элемент, які меў пяць судзімасцей і некалькі прыводаў.

Выконваючы абавязкі дырэктара трэста Белторф Саўковіч выслужваўся на выключаных з партыі, праяўляў паказную пільнасць. Калі на яго паступіў кампраметуючы матэрыял, ён, даведаўшыся, што расследванне даручана члену партыі тав. Дзедзікавай, прыклаў усе намаганні, каб зганьбіць яе і дабіўся выключэння з партыі і зняцця яе з работы. Саўковіч рашыў звесці асабістыя рахункі і з намеснікам наркома мясцовай прамысловасці тав. Галуза. З гэтай мэтай Саўковіч пайшоў на яўны падлог. Скарыстаўшы сваё становішча парторга, ён вырваў з кнігі адзін пратакол партыйнага схода, у якім было запісана выступленне тав. Галуза. У новасфабрыкаваным пратаколе Саўковіч сказіў гэту прамову, прыпісаўшы тав. Галуза абарону выкрытых ворагаў. Адначасова з гэтым Саўковіч не спыняў рассылку заяў у партыйныя органы і газеты з хлуснёй на тав. Галуза.

Пярвічная партарганізацыя замест таго, каб закляйміць гэтага кар'ерыста, вынесла падхалімскую пастанову, у якой просіць вышэйстаячыя арганізацыі зацвердзіць Саўковіча дырэктарам Белторфа, як «выдатнага гаспадарніка».

Дакладчык паведаміў пленуму аб росце гарадской партыйнай арганізацыі. За ўвесь 1937 год было прынята 111 чалавек у рады партыі, а за тры месяцы 1938 года — 290. Не гледзячы на значны рост у параўнанні з мінулым годам, усё-ж нельга яго прызнаць дастатковым. Толькі па Кагановіцкаму горрайкому 79 пярвічных партарганізацый не прынялі ў партыю ні аднаго чалавека. У радзе выпадкаў наглядаецца цяганіна, вялікая зацяжка разгляду заяў аб прыёме ў партыю і афармлення партыйных дакументаў. Так, Сталінскі горрайком не выдаў партдакументаў 89 комуністам, з якіх 64 новапрынятыя ў рады КП(б)Б, і 25 адноўлена, як няправільна выключаныя з партыі.

Маюць месца і выпадкі несур'ёзнага падыходу пры прыёме ў партыю. З прынятых партарганізацыяй фабрыкі «Комунарка» 5 чалавек гаркомам зацверджан толькі 1.

У заключэнне тав. Матвееў гаворыць аб задачах партарганізацый у сувязі з выбарамі кіруючых парторганаў.

Трэба адзначыць, што даклад тав. Матвеева быў недастаткова самакрытычным. Дакладваючы аб выкананні рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б), ён не завастрыў увагу пленума вакол тых памылак, якія былі дапушчаны гаркомам партыі ў адносінах да разгляду спраў асобных комуністаў. З даклада выпала таксама такое важнейшае пытанне, як уздым партыйна-палітычнай і арганізацыйнай работы. Гаворачы аб падрыхтоўцы да выбараў кіруючых парторганаў, тав. Матвееў не зрабіў аналізу праведзеных ужо першых справаздачна-выбарчых сходаў па гораду, не паказаў на недахопы і стачоўчы вопыт, што хацелі пачуць сакратары парткомаў і парторгі, якія рыхтуюцца ў сваіх партарганізацыях да справаздачна-выбарчых сходаў.

Не паказаўшы прыкладу самакрытыкі ў сваім дакладзе, тав. Матвееў гэтым самым не мабілізаваў пленум на ўскрыццё ўсіх недаопаў у рабоце гаркома. Спрэчкі праходзілі не на высокім палітычным узроўні, пры нездавальняючай актыўнасці членаў пленума.

Сёння работа пленума прадаўжаецца.

Склад новавыбранага партыйнага камітэта менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава. НА ЗДЫМКУ (злева направа): А. І. Золаў і І. Н. Кацовіч. У верхнім радзе — В. В. Драбышэўскі, Ф. А. Уманскі і А. П. Ціханаў. Фото С. Грына.

КРЫТЫКАВАЛІ НЕ ЗВАЖАЮЧЫ НА АСОБЫ

8 красавіка праходзіў справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі гомельскага завода сельскагаспадарчых машын «Рухавік рэволюцыі».

Арганізацыйна сход быў падрыхтаван вельмі дрэнна. Пачаўся ён на поўгадзіны пазней вызначанага часу. Памяшкання для правядзення партыйнага схода не было. Прышлося сход праводзіць у кабінеце дырэктара завода. Сюды, да дырэктара, у часе схода часта прыходзілі беспартыйныя таварышы за подпісам розных паперак. Комуністы прышлі на сход прама ад станкоў, не памыўшыся, без абеда, сядзелі ў рабочай вопратцы, у галаўных уборах.

У сваім справаздачным дакладзе сакратар парткома тав. Русакоў значнае месца ўдзяліў пытанню гаспадарчай работы. Менш за ўсё ён гаварыў аб партыйна-палітычнай рабоце, аб выхаванні комуністаў, аб росце партыі. Ніводнага слова не сказаў ён і аб выкананні рашэння студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б).

У спрэчках комуністы дапоўнілі дакладчыка. Усяго па справаздачы парткома выступіла 12 чалавек. Выступаючыя крытыкавалі работу парткома, ускрывалі недахопы і тут-жа ўносілі прапановы для паляпшэння партыйна-масавай работы.

Сход праходзіў на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Крытыка была разгорнута не зважаючы на асобы. Крытыкавалі па-большэвіцку.

За што-ж крытыкавалі партком?

А вось за што. Партарганізацыя завода мае шырокую базу і моцныя рэзервы для росту. На заводзе ёсць 158 стахановаўцаў і 36 ударнікаў. Гэта, у большасці—лепшыя кадры завода, актыўныя грамадскія работнікі, якія не раз на справе паказалі сваю адданасць справе Леніна — Сталіна — справе комунізма. Апрача таго, пры партарганізацыі завода ёсць група спачуваючых з 14 чалавек і комсамольская арганізацыя з 53 чалавек. Але партком нічога канкрэтнага не зрабіў, каб выхоўваць гэтыя кадры беспартыйнага актыва і ўцягваць лепшых з іх у рады партыі.

Яркім доказам адсутнасці палітычна-выхаваўчай работы сярод беспартыйных рабочых з'яўляецца той факт, што за мінулы год у кандыдаты партыі прынят толькі адзін чалавек.

Выступіўшы ў спрэчках тав. Курцэр рэзка крытыкаваў работу парткома за адсутнасць сістэматычнай работы з агітатарамі і палітбяседчыкамі. Партком не праводзіў з імі заняткаў, не забяспечваў іх неабходнай літаратурай, не дапамагаў ім у штодзённай ганаровай рабоце як на ўчастку, так і на заводзе.

— Праверка выканання дырэктыў і рашэнняў партыйных сходаў, — гаворыць тав. Шапіхін, — у нас не практыкуецца. Мы выносім многа рэзалюцый, добрыя прапановы, але выкананне іх не правяраем.

Комуністы гаварылі аб неабходнасці ўзмацнення большэвіцкай пільнасці, аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на прадпрыемстве; яны прыводзілі факты, што на заводзе і зараз яшчэ ёсць нявыкрытыя варожыя элементы, якія імкнуцца падарваць работу завода.

Пасля абмеркавання справаздачы парткома сход прыступіў да выбараў. Тайным галасаваннем быў выбран партыйны камітэт, у які ўвайшлі лепшыя большэвікі, палітычна правераныя на практычнай рабоце комуністы, як тт. Шапіхін, Русакоў, Прыбыльскі, Сапега і Абрамовіч. Сакратаром парткома выбран тав. Русакоў.

М. Н. ПУГАЧ.

УМАЦОЎВАЕМ СУВЯЗЬ З МАСАМІ

Партарганізацыя віцебскай панчошнай фабрыкі «КІМ» разам з праведзенай вялікай работай па разгрому ворагаў народа і выкарчоўванню шкодніцтва дапусціла рад памылак у вырашэнні партыйнасці асобных членаў партыі.

У перыяд абмену партыйных дакументаў за «пасіўнасць» была выключана з кандыдатаў партыі тав. Крыцкая. Пасля, пры дэтальнай праверцы, устаноўлена, што Крыцкая працавала на фабрыцы імя Клары Цэткін, з'яўлялася ўдарніцай і прымала актыўны ўдзел у палітычным жыцці. Яе, як аўтарытэтнага і выдатнага таварыша, вылучылі працаваць у паштовае аддзяленне сувязі, але ў рабоце ніякай дапамогі не аказвалі.

Зараз тав. Крыцкая адноўлена ў кандыдатах партыі і па-стаханаўску працуе на вытворчасці.

Член партыі з 1927 года тав. Парэцкі Меер Грыгор'евіч атрымаў суровае партыйнае спагнанне толькі за тое, што ён выпадкова трапіў на квадэру ворага народа.

Зараз тав. Парэцкі рэабілітаван і вылучан на кіруючую гаспадарчую работу — галоўным механікам фабрыкі, актыўна працуе па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Выконваючы рашэнне студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), партыйная арганізацыя праводзіць вялікую работу па ўмацаванню сувязі з беспартыйнымі масамі і папаўняе свае рады за лік лепшых людзей, якія на справе паказалі адданасць партыі Леніна—Сталіна, якія праявілі сябе ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР як добрыя арганізатары, здольныя агітатары і прапагандысты, перадавікі і арганізатары стаханаўскага руху.

За ўвесь 1937 год мы не прынялі ні аднаго чалавека ў партыю, а за студзень—сакавік 1938 года прынялі 21 чалавека.

Прыняты ў кандыдаты партыі — тав. Дворкін — малады спецыяліст-механік, працуе начальнікам фарбавальна-апрэтурнага цэха, паказвае ўзоры арганізаванасці ў рабоце, з'яўляецца прапагандыстам комсамольскай палітсеткі; тав. Ляхоўскі М. І.— актыўны комсамолец, член камітэта, прапагандыст комсамольскай палітсеткі; тав. Анікул І. Н. — кантрольны майстар; Крэслаўская Г. М. — актыўная комсамолка, выдатная стаханаўка; тав. Малочнікава Л. А. — тэхнік; тав. Усханаў і інш.

Аднак, у рабоце па прыёму ў партыю мы маем рад фактаў, калі асобныя комуністы, баючыся «як-бы чаго не вышла», не даюць рэкамендацыі таварышам для ўступлення ў партыю. Да такіх адносіцца тав. Левітанус.

Партыйная арганізацыя ўдзяляе пэўную ўвагу вылучэнню актывістаў-агітатараў, членаў выбарчых камісій і даверaных асоб на кіруючую работу гарадскога маштаба і ўнутры прадпрыемства. Вылучана за апошні час больш 50 чалавек: інструктарамі ГК КП(б)Б—2 чалавекі, сакратарамі парткомаў — 2 чал., дырэктарамі прадпрыемстваў — 4 чал. Начальнікамі цэхаў і іх намеснікамі і на іншыя кіруючыя работы ўнутры фабрыкі вылучана больш 40 чалавек.

Рыхтуючыся да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, мы паставілі перад сабой задачу максімальна скарыстаць свой вопыт, які мы атрымалі ў выбарчай кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

Зараз на былых выбарчых участках праводзіцца вялікая работа, куды накіравана 107 агітатараў, якія правядзяць заняткі ў 77 гуртках з ахопам 1.700 чалавек выбаршчыкаў. Агітатарамі працуюць 42 комуністы, 52 комсамольцы, 9 спачуваючых і 4 беспартыйныя. Гурткі працуюць адзін раз у пяцідзенку. Зараз у гэтых гуртках шырока разгорнута вывучэнне Канстытуцыі, «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР»; праводзяцца таксама гутаркі па пытаннях міжнароднай палітыкі і ўнутранага становішча СССР.

За апошні час апрача заняткаў у гуртках праведзена 25 сходаў і лекцый на розныя тэмы, на якіх прысутнічала 7.650 чал. слухачоў.

Добра працуе гурток на былым 67 выбарчым участку, якім кіруе агітатар, кандыдат партыі тав. Дворкін В. У яго гуртку займаюцца і рэгулярна наведваюць заняткі 14 хатніх гаспадынь.

Цікава і жыва праводзіць заняткі ў гуртках хатніх гаспадынь на былым 67 выбарчым участку комсамолец тав. Салтанаў.

Добрым агітатарам сярод выбаршчыкаў былога 65 выбарчага ўчастка з'яўляецца комуністка тав. Леонава І. Яна з вялікім інтарэсам праводзіць заняткі сярод выбаршчыкаў, карыстаецца ў іх вялікім аўтарытэтам. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

Партыйным камітэтам арганізаваны без адрыву ад вытворчасці 10-дзённыя курсы агітатараў з ахопам 45 чал., з якіх выпушчана ўжо 23 чал. І заканчвае другая чарга — 22 чал. Таксама скончылі курсы 25 рэдактараў штодзённых насценных газет. Арганізаван і праводзіцца з агітатарамі інструктаж-семінар перад пасылкай іх на выбарчы ўчастак.

Партком у сваёй далейшай практычнай рабоце паставіў сваёй задачай поўнасцю ліквідаваць маючыяся недахопы ў выкананні рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), сакавіцкага пленума ЦК КП(б)Б, падрыхтавацца і правесці выбары ў Вярхоўны Совет БССР на высокім палітычным узроўні, узорна мабілізаваць масы на барацьбу за выкананне пастаноў партыі і ўрада.

Разам з гэтым наша партыйная арганізацыя актыўна рыхтуецца да справаздачна-выбарнага партыйнага схода. Па ўсіх васьмі партыйных групах фабрыкі былі абмеркаваны пастанова і інструкцыя ЦК ВКП(б) аб выбарах кіруючых партыйных органаў.

Па праверцы работы парткома ўдзельнічае 37 комуністаў. Вышаў чарговы нумар шматтыражкі «Кімавец», прысвечаны рабоце парткома.

Апрача таго, да справаздачна-выбарнага схода партарганізацыі, які адбудзецца 15 красавіка, у цэхах рыхтуюцца спецыяльныя нумары насценгазет. Комуністы, якія працуюць ля станкоў, паказваюць большэвіцкія ўзоры выканання промфінплана.

Трэба спадзявацца, што наша партыйная арганізацыя правядзе справаздачна-выбарны сход на высокім ідэйна-палітычным узроўні, пры шырокім разгортванні большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі і выбярэ ў склад новага парткома праверaных і адданых справе Леніна—Сталіна большэвікоў.

А. К. ЛАПАЦІН,
сакратар партыйнага камітэта віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ».

ПЛЕНУМ МАГІЛЕЎСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

9 красавіка адбыўся пленум Магілеўскага гаркома КП(б)Б з удзелам усіх сакратароў парткомаў і парторгаў пярвічных партыйных арганізацый горада.

Пленум разгледзеў пытанні: аб палітычных задачах партарганізацыі ў сувязі з выбарамі ў Вярхоўны Совет БССР, аб правядзенні выбараў кіруючых парторганаў і арганізацыйныя пытанні.

З дакладам па першаму пытанню выступіў выконваючы абавязкі сакратара ЦК КП(б)Б тав. Рыпінскі. Па другому пытанню з дакладам выступіў сакратар Магілеўскага гаркома тав. Шуб.

У спрэчках па дакладах выступіла 13 чалавек, пасля чаго па абодвух дакладах былі прыняты пастановы.

Пленум выбраў першым сакратаром гаркома сакратара аргбюро ЦК КП(б)Б па Магілеўскай вобласці тав. Рыпінскага. Другім сакратаром выбран тав. Шуб.

У рабоце пленума прымаў удзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. Лявіцкі.

ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ І ПРОЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ

Магутная сіла совецкага патрыятызма акрыляе сыноў і дачок нашай цудоўнай радзімы, натхняе іх на бясприкладныя ў гісторыі подвігі, падвесцярае іх сілы ў барацьбе і будоўлі соцыялізма.

З думкай аб радзіме, аб гераічным нашым народзе, аб слаўнай партыі большэвікоў, аб таварышу Сталіну, чыё імя — увасабленне маральнага і палітычнага адзінства совецкага народа, тварыла легендарная чацвёрка — Папанін, Шыршоў, Крэнкель і Фёдараў — сваю неўвядальную справу, выклікаючы пачуцці захаплення і зачаравання ў чэсных людзей усяго свету.

З вобразам радзімы ў сэрцы нашы героі-пагранічнікі паказваюць цуды адвагі ў барацьбе з бандамі дыверсантаў, узоры храбрасці і вынаходлівасці ў спайманні самых мацёрых шпіёнаў. На карысць радзімы слаўная совецкая разведка разблытвае самыя страшэнныя хітраспляценні ворага, разбурае ўсе яго д'явальскія, здрадніцкія планы.

Любоў да зямлі роднай, палітай потам і кроўю шматлікіх пакаленняў, прывязанасць да свайго народа заўсёды жылі ў сэрцах працоўных мас. Гэтыя пачуцці не раз параджалі адпор ненавісным чужаземным захватчыкам. Сілу гэтага адпору каля 700 год назад адчулі нямецкія грабежнікі, іменаваўшыя сябе рыцарамі, разгромленыя рускімі воінамі ў кровепралітнай сечы на ільду Чудскага возера. У пачатку мінулага стагоддзя ў грозным пажары народнай вайны бясслаўна згарэла магутнасць Напалеона, які ўварваўся ў Расію з арміяй з «двунадесяти языков».

Гарачая любоў да радзімы на працягу стагоддзяў памешчыцкага і буржуазнага ўладарства спалучалася ў лепшых людзей нашай краіны з палкай нянавісцю да яе прыгнятальнікаў. Сапраўднымі патрыётамі былі не «самодержцы всероссийские» — Александры і Нікалаі, пагарджаўшыя рускім народам і дрыжэўшыя ў страху перад заслужанай адплатай; не прадажныя нямецкія прахадзімцы, якія прагна таўпіліся вакол царскага трона; не сто тысяч дваран-памешчыкаў, што захапілі ў свае лапы львіную долю зямлі-карміліцы; не тоўстасумы-купцы і прамыслоўцы, якія абіралі, грабілі народ, душылі ў ім ўсё жывое, таленавітае, светлае.

Сапраўднымі патрыётамі нашай радзімы былі людзі, якія праславілі рускае імя цудоўнымі творэннямі чалавечай культуры, ворагі самадзяржаўя і памешчыцка-капіталістычнага гнёту, беззаветныя барацьбіты за справу працоўных і эксплаатуемых мас. Высокія патрыятычныя пачуцці жылі ў сэрцах Пушкіна і Белінскага, Добралюбава і Чэрнышэўскага, цэлай плеяды рэволюцыянераў, людзей, пракладваўшых новыя шляхі ў грамадскім жыцці, у навуцы і мастацтве.

І калі на гістарычную авансцэну выступіў пролетарыят, клас-гігант, закліканы крута павярнуць кола гісторыі, — яго свядомы і дзейсны авангард, кіруемы Леніным і Сталіным, высока падняў сцяг нацыянальнай вартасці і нацыянальнай гордасці нашага народа. У імя любві да радзімы большэвікі змагаліся супроць бяссэнснай імперыялістычнай бойні, у якой дзеля нажывы кучкі капіталістаў і памешчыкаў гінулі мільёны людзей. Большэвікі рыхтавалі ператварэнне вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую, каб раз назаўсёды вызваліць нашу радзіму ад ганьбячых яе акоў царска-памешчыцкай шайкі і вывесці яе на шырокі, слаўны шлях соцыялізма.

У чорныя годы імперыялістычнай бойні Ленін ставіў пытанне: «Ці чужое нам, велікарускім свядомым пролетарыям, пачуццё нацыянальнай гордасці?»—І адказваў: «Зразумела, не! Мы любім сваю мову і сваю радзіму, мы больш за ўсё працуем над тым, каб яе працоўныя масы (г. зн. дзевяць дзесятых яе насельніцтва) падняць да свядомага жыцця дэмакратаў і соцыялістаў. Нам балючэй за ўсё бачыць і адчуваць, якім гвалтам, гнёту і здзекам падвяргаюць нашу цудоўную радзіму царскія каты, дваране і капіталісты. Мы ганарымся тым, што гэтыя гвалты выкліквалі адпор з нашага асяроддзя, з асяроддзя велікарусаў, што гэта асяроддзе высунула Радзішчава, дзекабрыстаў, рэволюцыянераў, розначынцаў 70-х годаў, што велікарускі рабочы клас стварыў у 1905 годзе магутную рэволюцыйную партыю мас... Мы поўны пачуцця нацыянальнай гордасці, бо велікаруская нацыя **таксама** стварыла рэволюцыйны клас, **таксама** даказала, што яна здольна даць чалавецтву вялікія ўзоры барацьбы за свабоду і за соцыялізм».

«Мы — абаронцы цяпер, 7 лістапада (25 кастрычніка) 1917 г.», — гаварыў Ленін. Усесакрушальную сілу совецкага патрыятызма адчулі на сабе інтэрвенты—разбойніцкія банды германскага, японскага, англійскага і т. д. імперыялізма, іх белагвардзейскія халопы, подлыя трацкісцка-бухарынскія прадажныя шпіёны і правакатары. На грозны баявы кліч «Социялистычная бацькаўшчына ў небяспецы!» спяшаліся на франты грамадзянскай вайны піцерскія металісты і іванава-вазнесенскія ткачы, маскоўскія рабочыя і шахцёры Данбаса, спяшаліся мільёны рабочых і сялян.

Совецкі патрыятызм стаў велізарнай сілай. З кожнай новай перамогай соцыялізма ён рос ушыр і ўглыб. Любоў да соцыялістычнай радзімы непарыўна больш магутная і дзейсная, чым усякі патрыятызм, які быў калі-небудзь вядомы гісторыі.

Совецкі патрыятызм свабодны ад таго адчування горычы, якое раней было неразрыўна звязана з пачуццем нацыянальнай гордасці — горычы за ўніжэнні і здзекі, тварымыя над народам эксплаататарамі. У гэтым — крыніца велізарнай сілы совецкага патрыятызма.

Патрыятызм многанацыянальнага совецкага народа зусім чужы і ў корані варожы ўсякаму шавінізму, усякаму пачуццю нацыянальнай выключнасці.

Росквіт шматлікіх нацый нашай радзімы даказвае гэта бясспрэчнай мовай рэальных фактаў. Совецкі патрыятызм неразрыўна звязан з пролетарскім інтэрнацыяналізмам. У нашай краіне творыцца справа ўсяго перадавога чалавецтва. Яе прыклад магутным маяком свеціць усім барацьбітам супроць фашысцкага варварства і ізуверства, супроць цёмных сіл буржуазнай рэакцыі, якія нясуць чалавецтву гібель у засценках Гестапо, у бамбардыроўках мірных гаралоў, у морах крыві.

СССР — бацькаўшчына працоўных усяго свету!

Таварыш Сталін у адказе комсамольскаму прапагандысту тав. Іванову з усёй сілай падкрэсліў небяспеку ваеннага нападу на нашу соцыялістычную бацькаўшчыну Да таго часу, пакуль існуе небяспека інтэрвенцыі і рэстаўрацыі капіталістычных парадкаў у мясцах, якія могуць быць заняты інтэрвентамі, перамога соцыялізма ў нашай краіне не можа лічыцца канчатковай. Каб яна стала такой, неабходна злучэнне «сур'ёзных намаганняў міжнароднага пролетарыята з яшчэ больш сур'ёзнымі намаганнямі ўсяго нашага совецкага народа» **(Сталін).**

Узмацняць і развіваць інтэрнацыянальныя пролетарскія сувязі, няспынна ўмацоўваць абарону СССР, магутнасць яго ўзброеных сіл—такі вывад.

«Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...» **(Сталін).**

Совецкі народ моцна памятае сталінскія словы. Яны прымушаюць яшчэ мацней любіць сваю радзіму-маці, яшчэ больш арганізавана і самааддана прапаваць на яе карысць, умацоўваць яе магутнасць.

«ПРАВДА».

СПРАВАЗДАЧНЫ ДАКЛАД ПАДРЫХТАВАН НАСПЕХ

Комуністы партарганізацыі менскай металаапрацоўчай арцелі «Чырвоны інвалід» сабраліся задоўга да пачатку схода. Разгавор зайшоў аб члене партыі, старшыні арцелі тав. Ноіме, які, ведаючы, што 9 красавіка адбудзецца справаздачна-выбарчы сход, усё-ж ні з чым не палічыўся і паехаў у «неадкладную камандзіроўку». Таварышы ўспомнілі аб адсутнічаючым члене партыі тав. Перальмане, які прыйсці на сход сапраўды не мог. Жыве ён далёка, пасля хваробы дрэнна сябе адчувае. Тав. Перальману неабходна было аказаць дапамогу сродкамі перасоўвання. Аднак, напярэдадні схода аб гэтым ніхто не падумаў.

Парторг тав. Арцюшэўскі ў сваім 50-мінутным дакладзе гаварыў аб усім. Даклад насіў бессістэмны характар, у ім адсутнічала палітычная завостранасць, ён не мабілізоўваў комуністаў на вузлавых пытаннях партыйнай работы. Адчувалася, што справаздачны даклад складаўся парторгам наспех, быў непрадуманы. Комуністы да складання справаздачнага даклада не былі прыцягнуты.

— У нас, — гаворыць тав. Арцюшэўскі, — няма росту партыі за лік лепшых рабочых-стаханаўцаў, слаба пастаўлена работа са спачуваючымі, да партсходаў мы дрэнна рыхтаваліся, не ўсе выконваюць партдаручэнні.

У такім стылі быў пабудован даклад. Ніякага аналіза работы, ніякіх вывадаў дакладчык так і не зрабіў. Вострыя пытанні работы партарганізацыі, пытанні вытворчасці, крытыкі і самакрытыкі дакладчыкам былі старанна абыйдзены.

Выступіўшыя ў спрэчках члены і кандыдаты партыі тт. Фішар, Янушкевіч, Меер, Багдановіч, Мятліцкі значна дапоўнілі даклад парторга. На канкрэтных фактах яны ўказвалі, што парторг не клапаціўся аб члене партыі, яго росце, яго запатрабаваннях. Партдаручэнні ў партарганізацыі раздаваны няроўнамерна. Так, кандыдат партыі тав. Янушкевіч мае 4 партыйныя даручэнні, частку з якіх можна было даручыць і беспартыйным актывістам. Адстаючым таварышам у партыйнай вучобе не аказваецца ніякай дапамогі. Прыводзілася многа прыкладаў сямейнасці, нежадання выносіць «смецця з дому». Рэзка крытыкавалі парторга і за тое, што ён не кіраваў і не дапамагаў агітатарам у іх рабоце.

Аб недастатковай пільнасці комуністаў гаварыла член партыі тав. Меер. Яна прыводзіла прыклады, калі набор людзей у арцель перадаверылі другарадным работнікам. Старшыня арцелі тав. Ноім, парторг тав. Арцюшэўскі не вывучаюць людзей на вытворчасці, адсталым настроям не даецца адпору. З стаханаўцамі партарганізацыя работу не вядзе.

Выступаючыя тт. Янушкевіч і Мятліцкі завастрылі ўвагу партарганізацыі на неабходнасці ўзмацнення авангарднай ролі комуністаў на вытворчасці. Прыводзілася многа прыкладаў аб адсутнасці барацьбы з бракам, аб тым, што не ствараюцца ўмовы для работы стаханаўцам.

Спрэчкі паказалі, што за справаздачны перыяд комуністы значна выраслі. Іх выступленні былі палітычна завостраны, насілі дзелавы характар.

Г. ВЯРХОУСКІ.

ПЕРШЫ НУМАР ГАЗЕТЫ „СТАЛИНСКАЯ МОЛОДЕЖЬ"

Учора вышаў першы нумар новай рэспубліканскай газеты на рускай мове «Сталинская молодежь»—орган ЦК ЛКСМБ. У перадавым артыкуле пад назвай «Сталинская молодежь» газета піша: «Моладзь нашай краіны нязмерна горача любіць сваю родную партыю і таварыша Сталіна. Справамі яна дзякуе за клопаты, за давер'е, за жыццё пад шчаслівай совецкай зоркай. Яна гатова на любыя подвігі, яна гатова, калі гэта спатрэбіцца, аддаць усё сваё жыццё да апошняй кроплі крыві ў імя свяшчэннасці і непрыступнасці совецкіх рубяжоў, у імя радзімы».

Тыраж газеты—15.000 экземпляраў. Яна будзе выходзіць праз дзень.

НА УЗДЫМЕ

Аб фабрыцы «Комунарка» (Менск) на працягу доўгага часу ішла благая слава: яе прыводзілі як прыклад самага адстаючага прадпрыемства, сістэматычна не выконваючага сваёй вытворчай праграмы.

Пасля таго, як абнавілі кіраўніцтва і вылучылі на адказныя ўчасткі новых людзей — стаханаўцаў, адданых вытворчасці — пайшлі зусім іншыя справы.

Работа прадпрыемства за апошнія паўтара месяца аб гэтым гаворыць з усёй яскравасцю. Калі ў студзені фабрыка выканала свой план на 98 проц., то ў лютым выкананне павялічылася да 107 проц., а ў сакавіку (пры значным павелічэнні праграмы) — да 123 проц. Такой рэкордная выпрацоўкі фабрыка не мела з самага пачатку яе існавання. Галоўная асаблівасць гэтай перамогі ў тым, што вытворчы план перавыканалі ўсе цэхі, чаго ніколі не было.

Пералом на вытворчасці наступіў пасля таго, як кіраўнікі фабрыкі заняліся жывымі людзьмі, стварэннем ім умоў для ўзняцця прадукцыйнасці працы, заняліся перабудовай тых участкаў вытворчасці, якія рашаюць нармальны ход работы ўсіх цэхаў.

Раней амаль усе цэхі прастайвалі з-за адсутнасці тары. Сушылка была самым вузкім месцам на фабрыцы. Ніхто за яе работу не адказваў. Зараз у сушылцы ўведзен 4-зменны графік, замест ранейшага 3-зменнага. На чале яе пастаўлен кваліфікаваны майстар тав. Іваноў. Прастоі з-за тары амаль ліквідаваны.

Або возьмем работу вакуум-апаратаў. На фабрыцы іх усяго 5 штук, у рабоце заўсёды 3. Два апараты павінны быць у рэзерве. Раней-жа гэтыя рэзервныя апараты былі заўсёды няспраўнымі, і калі адзін з дзейнічаючых псаваўся—не было чым яго замяніць, што выклікала прастой у цэхах. Зараз усе апараты адрамантаваны і ў поўнай спраўнасці.

Прадукцыйнасць працы па ўсёй фабрыцы ў сакавіку павысілася на 20 проц. Новых поспехаў дабіліся стаханаўцы. Тав. Талеснікаў у сярэднім выканаў сваю месячную норму на 285 проц., тав. Індых — на 202 проц., тав. Глушанок — на 199 проц., тав. Дэлімаўеў — на 180 проц., тав. Яцкевіч — на 170 проц., тав. Цыгельніцкая — на 160 проц. і інш.

Сабекошт прадукцыі зніжан у лютым супроць плана мінулага года на 3,23 проц. Значна зменшыліся вытворчыя прастоі. У студзені фабрыка прастаяла 4.225 чалавека-гадзін, а ў лютым яны зніжаны да 1.616, у сакавіку да—929.

24 сакавіка фабрыка датэрмінова выканала свой квартальны план на 110,7 проц. Звыш плана выпушчана прадукцыі на 686 тысяч рублёў.

У сувязі з набліжэннем першамайскага свята, у цэхах і брыгадах паднялася новая хваля соцыялістычнага спаборніцтва. У карамельным цэху пачалося ўкараненне металаў працы вядомай стаханаўкі маскоўскай кандзіцерскай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» тав. Юдзінай, якая прапускае на сваім працэсе (ручное абгортванне) 90 кгр. цукерак за змену (норма — 50 кгр.).

125 загортшчыц карамельнага цэха дэтальна вывучаюць на занятках па тэхвучобе выдатны вопыт работы тав. Юдзінай. У сучасны момант па гэтаму метаду працуе ўжо 35 чалавек. Калі раней стаханаўка Яцкевіч-Шнытко загортвала за змену самае большае 65—68 кгр. цукерак, то зараз, працуючы па новаму метаду тав. Юдзінай, яна дала рэкордную выпрацоўку — 82 кгр. (норма — 51 кгр.). Стаханаўка т. Гарайс загортвае 70 кгр., тав. Жэбрык — 65 кгр.

З першага-ж дня другога квартала калектыў у цэлым і кожны цэх у асобку значна перавыконваюць свае штодзённыя планы. Так, 2 красавіка фабрыка дала 117 проц. плана, 3-га — 125 проц.

Паміж цэхамі разгарнулася соцспаборніцтва за атрыманне фабрычнага пераходнага чырвонага сцяга.

Калектыў фабрыкі абавязаўся сустрэць першамайскае свята новымі вытворчымі поспехамі — закончыць чатырохмесячную праграму датэрмінова і даць звыш плана на 800.000 рублёў прадукцыі.

Дабіўшыся значных поспехаў, кіраўніцтва фабрыкі павінна не аслабляць узятыя тэмпы. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на далейшае павышэнне якасці прадукцыі, поўную ліквідацыю прастояў у дражыровачным цэху, дзе часамі нехапае і зараз інвентару. У некаторых цэхах, як напрыклад машынным аддзяленні шакаладнага цэха, ёсць яшчэ нямала рэзерваў для далейшага павышэння прадукцыйнасці працы.

І. ТУРЭЦКІ.

СТАХАНАЎЦЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА. НА ЗДЫМКУ: трактарыстка Ранінскай МТС, Буда-Кашалёўскага раёна, тав. А. Тадорава ў першы дзень палявых работ узарала 8 гектараў замест нормы 6 гектараў. Гэтымі днямі тав. Тадорава падала заяву аб уступленні ў ЛКСМБ. (Белсаюзфото).

На калгасных палях

ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ

СТАРОБІН. У калгасах раёна разгортваецца сяўба ранніх і яравых культур. Пасеяны першыя сотні гектараў. Калгас «Вызваленне Беларусі», Чырвонаазёрскага сельсовета, ужо скончыў сяўбу пшаніцы і аўса. У куткім часе калгас прыступіць да сяўбы астатніх культур. У адказ на зварот СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб арганізацыі большэвіцкай барацьбы за ўраджай калгаснікі паказваюць узоры стаханаўскай работы. Цімох Каваленя, Васіль Ляўшэвіч і некаторыя іншыя калгаснікі сістэматычна выконваюць нормы выпрацоўкі на 190—200 проц.

Паспяхова разгарнуліся палявыя работы ў калгасе «Чырвоны Скаўшын». Тут ужо ўзарана 43 гектары і забаранавана больш 25. Калгаснікі раскарчоўваюць цаліну, на якой будуць пасеяны яравыя культуры.

У калгасе «17-годдзе Кастрычніка» пасеяна 4 гектары ранняй бульбы; у бліжэйшыя дні яе пасеюць яшчэ 14 гектараў. Малады стаханавец калгаса Іван Шульга, працуючы на ворыве, штодзённа выконвае норму на 200 проц.

З вялікім поспехам праходзяць палявыя работы ў калгасах «Комінтэрн», Лістападаўскага сельсовета, «Зара Палесся», Даланавіцкага сельсовета, «Квітнеючы май», Сухалільскага сельсовета.

П. ЛОЙКА.

НОВАЯ ХВАЛЯ ВЫТВОРЧАГА ЭНТУЗІЯЗМА

КАМАРЫН. У калгасах раёна актыўна прайшло абмеркаванне звароту СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб арганізацыі барацьбы за высокі ўраджай.

Брыгада Грышаненка Рыгора з калгаса «Трэці інтэрнацыянал» закончыла сяўбу ранніх яравых. Абмеркаваўшы зварот СНК БССР і ЦК КП(б)Б, калгаснікі абавязаліся змагацца ў гэтым годзе за тое, каб на кожны працадзень прыпадала па 5 кілограмаў зернавых, 15 кілограмаў бульбы і 2 рублі грашыма. Брыгада прыступіла да сяўбы ільну. Калгасніца Ніна Шам правяла падкормку пасеваў жыта на плошчы ў 2,5 гектара.

Калгас «Ударнік» закончыў сяўбу ранніх яравых. Усе 60 гектараў яравых пасеяны радковай сеялкай.

Знатная ў раёне звеннявая тав. Парфёнава абавязалася атрымаць сёлета ўраджай у 22 цнт. ячменю, 20 цнт. пшаніцы і 18 цнт. аўса з гектара. На плошчы ў 1 гектар Парфёнава абавязалася атрымаць ураджай у 12 цнт. ільнавалакна. Выдатна праходзяць у звяне палявыя работы. Сяўба праводзіцца выключна па добра ўгноенай глебе. (БЕЛТА).

ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ

ВІЦЕБСК. Багаты ўраджай атрымаў у мінулым годзе калгас «Інтэрнацыянал», Далжанскага сельсовета. Калгаснікі на працадні атрымалі сотні пудоў зярна, бульбы, гародніны і шмат грошай, за якія яны купляюць прыгожую мэблю, дарагую вопратку і іншыя тавары культуры і быту.

Калгас заслужана заваяваў славу паваколіцы. Зараз ён у поўнай гатоўнасці ўступіў у першую вясну трэцяй сталінскай пяцігодкі. Сваім багатым працаднём, добрай арганізацыяй работы калгас прыцягнуў асаблівую ўвагу аднаасобнікаў акружаючых вёсак.

Днямі 8 аднаасобнікаў — Рахоўскі, Навіцкі, Анушкін, Калінчэнка, Ясенеў, Каржанеўскі, Пучкароў і Старадубаў з вёсак Канавалава і Баранава падалі заявы аб прыёме ў калгас. Усе гэтыя аднаасобнікі агульным сходам былі прыняты ў калгас.

На калгасным сходзе Владзімір Ясенеў заявіў:

— Калгас «Інтэрнацыянал» дабіўся высокіх ураджаяў. Калгаснікі жывуць культурным і радасным жыццём. Я канчаткова пераканаўся, што толькі калгасны шлях,—шлях, указаны партыяй Леніна—Сталіна, з'яўляецца адзіна правільным шляхам для працоўнага сялянства да заможнага культурнага і шчаслівага жыцця.

За апошнія месяцы ў калгас «Другая большэвіцкая вясна», Елагінскага сельсовета, улілося звыш 30 аднаасобных гаспадарак.

В. АЛАН.

ХАТА-ЛАБАРАТОРЫЯ

Сход быў многалюдны. Сабраліся амаль усе калгаснікі сельгасарцелі імя Сталіна, каб яшчэ раз праверыць выкананне ўзятых на сябе абавязацельстваў па падрыхтоўцы да сяўбы.

Выступаючы старшыня калгаса Фёдар Кацько гаварыў аб рабоце хаты-лабараторыі.

— ...Мы павінны ганарыцца нашай хатай-лабараторыяй, работа якой высока ацэнена рэспубліканскімі арганізацыямі. Нашаму калгасу прадастаўлен гонар быць кандыдатам на права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. У гэтым нам многа дапамагла хата-лабараторыя.

Хата-лабараторыя калгаса была арганізавана ў 1936 годзе. Загадчыкам быў вызначан лепшы калгаснік Павел Сцяпанавіч Бягун.

У першы-ж год былі засеяны вопытныя ўчасткі аўса, ячменю і пшаніцы на тарфяніку. Усімі вопытнымі работамі кіраваў П. Вайцэховіч — аграном Інстытута балотнай гаспадаркі. Вынікі работы былі добрыя. Авёс і ячмень далі высокі ўраджай. Аднак, на гэтым у калгасе не спыніліся.

У 1937 годзе хата-лабараторыя правяла сортавыпрабаванне аўса, пшаніцы, жыта і іншых культур на тарфяніку, у які было ўнесена мінеральнае ўгнаенне. Акрамя гэтага, па ініцыятыве хаты-лабараторыі было праведзена залужэнне некалькіх дзесяткаў гектараў балотнай зямлі. Упершыню была пасаджана капуста і засеяна сталовая морква на тарфяніку.

Усімі агранамічнымі работамі па пасевах, догляду і ўборцы культур кіравала хата-лабараторыя.

Вынікі былі бліскучыя. Калгас у цэлым атрымаў высокі ўраджай зернавых, небывалы ўраджай капусты і сталовай моркві. З залужанага ўчастка было сабрана па 80 цэнтнераў сухога сена з гектара. Калгас поўнасцю забяспечыў сябе кармамі.

Вопытныя-ж ўчасткі далі значна вышэйшы ўраджай. Жыта дало каля 33 цэнтнераў, авёс каля 36 і пшаніца каля 25 цэнтнераў з гектара. Экспанаты калгаса, прадстаўленыя на Усебеларускую выстаўку, былі адабраны і калгасу быў выдан пахвальны дыплом.

Вопыт работы хаты-лабараторыі падхапілі іншыя суседнія калгасы. Яны таксама выдзелілі ўчасткі пад пасевы капусты і сталовай моркві на тарфяніках, пачалі залужэнне балот.

Да пасеўнай кампаніі гэтага года хата-лабараторыя разгарнула падрыхтоўку яшчэ зімой. Па яе ініцыятыве ўсё насенне калгаса было своечасова ачышчана і праверана на ўсхожасць, пад пасевы асобных культур былі вызначаны спецыяльныя ўчасткі. Сам загадчык хаты-лабараторыі Павел Сцяпанавіч не раз правяраў як захоўваецца насенне, як адрамантаван сельскагаспадарчы інвентар і кожны раз, калі знаходзіў што-небудзь ў непарадку, даваў карысныя парады.

У гэтым годзе хата-лабараторыя праводзіць вопытныя пасевы ў значна большых размерах. На тарфяніку будуць засеяны рэкордныя ўчасткі аўса, ячменю, з якіх таварыш Бягун абяцае сабраць не менш, як 50 цэнтнераў добраякаснага зярна з кожнага гектара. Акрамя гэтага будзе праведзена падкормка залужанай сенажаці, з якой мяркуецца атрымаць не менш, як па 100 цнт. сухога сена з кожнага гектара.

...Сход скончыўся даволі позна. Абменьваючыся думкамі, калгаснікі невялікімі групамі накіроўваліся дамоў. Яснавокі месяц, высока ўзняўшыся на небе, асвятляў ім шлях да ўтульных, напоўненых багаццем хат, дзе іх чакалі сытая вячэра і адпачынак.

***

Дзень выдаўся цёплы і сонечны. З самага рання трактарыст Камлюк пачаў дыскаванне глебы на вопытным участку, прызначаным пад пасевы аўса і ячменю. Магутны «чэлябінец» лёгка цягнуў дыскавыя бораны. Вострыя дыскі глыбока ўразаліся ў тарфяную глебу, разразаючы на дробныя кавалачкі дзерваны зяблевага ворыва і пакідаючы за сабой чорную паласу рыхлай зямлі.

Малады жыццерадасны Камлюк, заварачваючыся ў канцы ўчастка, запытаў у загадчыка хаты-лабараторыі які ў гэты час падвозіў мінеральныя ўгнаенні на ўчастак:

— Як вы справіцеся з работай, Павел Сцяпанавіч? Ці паспееце вы сёння высеяць усе ўгнаенні?

— Не толькі высеяць паспеем, — упэўнена адказаў Павел, — а нават і забаранаваць.

Калгаснікі прыступілі да рассеву ўгнаенняў. Лепшыя сяўцы—60-гадовыя старыкі Васіль Камлюк і Іван Валчок—рассявалі, а ўслед за імі праводзілі баранаванне двое маладых хлапцоў.

Павел Сцяпанавіч і аграном Вайцэховіч бралі пэўную колькасць суперфасфату, калійнай солі і калчаданнага агарка, старанна змешвалі іх і толькі ў такім выглядзе перадавалі для высеву.

Работа ішла хутка і весела. Да вечара былі высеяны ўсе ўгнаенні і ўчастак паспелі забаранаваць. Весёлыя, задаволеныя сваёй работай калгаснікі варочаліся з поля. На іх тварах не было і цені стомленасці або няўпэўненасці ў сваёй рабоце.

Ідучы дамоў, Павел Сцяпанавіч і некалькі калгаснікаў зайшлі ў хату-лабараторыю, каб праверыць паказанні барометра, — даведацца аб чакаемым надвор'і. Хата ў многім нагадвала сабой хімічную лабараторыю з мноствам рознай хімічнай пасуды на сталах і ў шафах. На вокнах, у спецыяльных прабірках, былі выстаўлены ўзоры лепшых сартоў насення аўса, пшаніцы, ячменю, жыта і іншых культур, якія сеяліся ў мінулыя годы на калгасным полі. На сценах віселі старанна загорнутыя ў паперу ўзорныя экспанаты гэтых культур, адабраныя на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. У хаце было чыста і прыгожа.

Павел Сцяпанавіч, паказваючы лепшыя экспанаты, расказваў нам аб сваёй рабоце па падняцію ўраджайнасці. Цёплая, жыццерадасная ўсмешка была на яго смуглявым твары, калі ён, разгарнуўшы паперу на адным з экспанатаў, паказаў яго нам. Гэта быў невялікі сноп жыта. Чыстыя, роўныя сцяблы жаўтаватага колеру, аздобленыя буйным калоссем, былі надзвычайна вялікага росту.

— З такога жыта і конніка не будзе відаць, — пажартаваў адзін з калгаснікаў.

— Нямала нам прышлося папрацаваць, — расказваў Павел. — Пасевы былі праведзены загадзя на тарфяніку, добра ўгноеным мінеральнымі ўгнаеннямі. Летам мы змагаліся з пустазеллем хімічным спосабам. У сваёй рабоце мы строга прытрымліваліся ўсіх агратэхнічных правіл і парад аграномаў, і ў выніку — змаглі дабіцца высокага ўраджаю.

Павел паказаў нам яшчэ некалькі экспанатаў пшаніцы, аўса і ячменю. Усе яны ласкалі вока сваім ростам і буйным коласам.

Калгаснікі разам з Паўлам Сцяпанавічам праверылі паказанні барометра. Барометр падымаўся, — набліжалася цёплае сонечнае надвор'е, падыходзячае для сяўбы. Задаволеныя набліжэннем добрага надвор'я, калгаснікі, ведучы ажыўленую гутарку, пакідалі хату-лабараторыю, накіроўваючыся дамоў адпачываць.

С. РОЗУМ,
калгас імя Сталіна, Кайкаўскага сельсовета, Менскага раёна.

НА СПЛАЎУЧАСТКАХ НЯМА ДРАЎНІНЫ

ГОМЕЛЬ. **(Спец. кар. «Звязды»).** Гомельская сплаўкантора ў гэтым годзе больш падрыхтавана падышла да сплаву. Кантора поўнасцю забяспечана снасцямі. тросамі, ланцугамі, усім неабходным такелажам. Падрыхтаваны два плывучыя інтэрнаты на 80 чалавек, інтэрнат на 80 чалавек у самім Гомелі. Адрамантавана плывучая культбаза, якая мае кіноперасоўку, радыё, бібліятэку і інш.

Аднак, сплаўныя работы пакульшто разгортваюцца далёка нездавальняюча. Справа ў тым, што сплаўныя ўчасткі не маюць чаго сплаўляць. У гэтым годзе павінна быць сплаўлена 220 тысяч кубаметраў страявога лесу і дроў. Між тым, да сплаўных участкаў падвезена толькі каля 50 процантаў неабходнай колькасці лесу і дроў.

Горацкі, Чэрыкаўскі, Чачэрскі і Касцюковіцкі леспрамгасы сарвалі план падвозкі лесу. Так, напрыклад, Горацкі леспрамгас замест 8.800 кубаметраў страявога лесу і 2.500 кубаметраў дроў вывез толькі 5.600 кубаметраў страявога лесу і 1.900 кубаметраў дроў. Чэрыкаўскі леспрамгас замест плана 5.340 кубаметраў страявога матэрыялу і 19.000 кубаметраў дроў вывез адпаведна 26.200 і 12.900. Яшчэ горш справы па Чачэрскому леспрамгасу. Тут вывезена менш 40 проц. лесаматэрыялаў.

Рад сплаўучасткаў яшчэ не ўкамплектован патрэбнай колькасцю рабочай сілы. Усяго па плану трэста Лесбел павінна быць завербавана 1.400 чалавек, а завербавана толькі 825 чалавек. У невыкананні плана вярбоўкі рабочай сілы ў значнай меры вінават сам трэст Лесбел, які з вялікім спазненнем спусціў сплаўканторам нарады на вярбоўку рабочай сілы.

Выключна дрэнна абслугоўвае сплаўшчыкаў спажыўкааперацыя. На фарміровачных пунктах Бакуновічы, Крыс, Казацкія Балсуны і інш. — у месцах найбольшага канцэнтравання рабочай сілы — нават не адкрыты ларкі.

Тэрыгарыяльныя арганізацыі, на жаль, не ўдзяляюць патрэбнай увагі пытанням сплаву. Чэрыкаўскі райвыканком, напрыклад, абмежаваўся агульнымі ўказаннямі сельсоветам аб дапамозе ў вярбоўцы рабочай сілы на сплаў, але нават не пацікавіўся правяць як выконваюцца яго дырэктывы.

БІБЛІЯГРАФІЯ

„НАВУКА У ТУПІКУ“

Пад такім загалоўкам «Соцэкгіз» выпусціў зборнік артыкулаў найбольш відных англійскіх вучоных-спецыялістаў аб становішчы навукі ў краінах капіталізма.

Радам цікавых фактаў гэтыя вучоныя паказваюць, што капіталізм і фашызм затрымліваюць навукова-тэхнічны прагрэс, абмяжоўваючы навуковадаследчую мысль толькі праблемамі знішчэння чалавецтва, праблемамі будучай імперыялістычнай вайны.

У артыкуле «Навука і прамысловасць» праф. Дж. Б. Бернал гаворыць, што сучасны капіталізм ставіць прамыя перашкоды навуковаму тэхнічнаму прагрэсу, наўмысля затрымлівае буйныя адкрыцці апошніх год, калі гэтыя адкрыцці не прыносяць прадпрыемцам вялікіх прыбыткаў.

«Нас пягнуць назад, — піша прафесар Бернал, — галоўным чынам не тэхнічныя, а эканамічныя фактары. На машыны і людзей глядзяць проста як на розныя бакі выдаткаў вытворчасці. Машыну канструіруюць для скарыстоўвання самай таннай і, значыць, самай манатоннай працы. Гэта ў корані пярэчыць духу механічных вынаходніцтваў. Калі-б машыны канструяваліся з пункту погляду інтарэсаў рабочага, а не мінімальных выдаткаў іх эксплаатацыі, то працаваць на машыне было-б таксама цікава і значна менш стамляюча, чым займацца сельскай гаспадаркай ці паляваннем».

Радам канкрэтных прыкладаў прафесар Бернал паказвае, што навуковая мысль дасягнула такога ўзроўню, што ў любой галіне прамысловасці новыя адкрыцці могуць зрабіць пераварот у вытворчасці.

Гады чатыры назад у адной з лабараторый было зроблена калоідна-рас шыраючаяся шкло. Яго к-штоўнасць заключаецца ў тым, што яно спалучае празрыстасць з цепла- і гуканепранікальнасцю, а па вазе лягчэй пробкі. «Ва ўсякім разумна кіруемым грамадстве, — піша прафесар Бернал, — усе намаганні былі-б накіраваны на тое, каб наладзіць яго вытворчасць у прамысловым маштабе. Аднак у гэтых адносінах да гэтага часу практычна нічога не было зроблена. Падобны лёгкі матэрыял рэволюцыянізуе прынцыпы архітэктуры і будаўніцтва. Мы змаглі-б будаваць такія лёгкія і зграбныя будынкі, якіх свет яшчэ ніколі не бачыў».

У галіне вытворчасці адзення не выключана магчымасць вырабу з цэлюлозы, пры дапамозе прамых хімічных і механічных металаў, новага матэрыялу. «З яго, — гаворыць аўтар,— можна будзе адліваць ці штампаваць адзенне, не прыбягаючы да прадзення, ткацтва, шыцця. Такое адзенне будзе каштаваць наўрад ці больш некалькіх пенсаў».

Але ўсе гэтыя і падобныя ім новыя вынаходніцтвы патрабавалі-б карэннай ломкі існуючых спосабаў вытворчасці.

А капіталістычны свет далёка не зацікаўлен у гэтым. «Бываюць выпадкі, — піша аўтар, — што вялікія фірмы замоўчваюць ці знішчаюць буйныя адкрыцці. Да тых-жа рэзультатаў, але яшчэ больш лёгкім спосабам, прыводзіць адмаўленне ад падтрымання даследвання ў пэўным кірунку».

Праф. Бернал прыходзіць да вываду, што «сучасны кірунак эканамічнага і палітычнага развіцця не пакідае ніякіх надзей на тое, што фізічная навука зможа рэалізаваць свае магчымасці ці хоць-бы ўнікаць скарыстання навукі для разбурэння свету, які яна дапамагла стварацъ».

«Калі навука хоча дапамагчы чалавецтву, — заканчвае аўтар свой артыкул, — яна павінна знайсці новага гаспадара».

Не лепш становішча навукі і ў земляробстве. Пра гэта піша сэр Даніэль Хол.

«Раней гаварылі, — піша аўтар, — што найвялікшым дабрадзеем грамадства быў чалавек, які вырасціў два коласы замест аднаго... Цяпер-жа чалавек навукі, які займаецца агрыкультурай, адчувае сябе вінаватым перад грамадствам. На працягу двух пакаленняў яго ўпрошвалі павышаць ураджайнасць зямлі і змяншаць выдаткі вытворчасці. Цяпер-жа, — гаворыць сэр Даніэль Хол, — амерыканскі прафесар агрыкультуры піша мне: «Дзесяць мільёнаў акраў баваўняніку і некалькі тысяч акраў табачных плантацый былі заараны. Апошні план заключаецца ў тым, каб знішчыць каля пяці мільёнаў свіней вагой менш 100 фунтаў і 200 тысяч свінаматак. Калі гэта прынясе нацыянальны росквіт, то я сваё жыццё патрацію даремна».

У гэтых словах амерыканскага прафесара з дастатковай яркасцю паказан той тупік, у якім апынулася навука пры сучасным капіталістычным грамадстве. Капіталістычны лад на сучасным этапе ставіць перад навукай задачы не стварэння, а разбурэння ўсяго таго, што створана пакаленнямі. У той час, калі велізарная большасць насельніцтва жыве ўпрогаладзь, галадае, незлічоная колькасць хлеба і мяса знішчаецца толькі для таго, каб захаваць высокія цэны на прадукты харчавання, каб буйныя капіталістычныя фірмы маглі здабыць сабе патрэбны прыбытак. Ім. вядома, больш выгадна знішчыць мільёны пудоў хлеба і мяса, чым знізіць цану на прадукты харчавання.

Даніэль Хол прыводзіць у сваім артыкуле нямала і іншых фактаў, якія паказваюць, што капіталістычнае грамадства патрабуе ад навукі не павелічэння, а абмежавання вытворчасці: у Бразіліі — спальваюць кофе, у Ірландыі — рэжуць цялят і т. д.

Рэзка асуджаючы варварскае знішчэнне прадуктаў, Даніэль Хол прапануе вырашыць аграрнае пытанне па прыкладу «рускага плана» (г. зн. калектывізацыі сельскай гаспадаркі).

Нават такія навукі, як біялогія, мелыцына і бактэрыялогія, не маюць перспектыў развіцця пры сучасным капіталістычным грамадстве. Пра гэта расказваюць у сваіх артыкулах доктар Энід Чарлз, праф. В. Х. Мотрам і доктар П. А. Горэр. «Зло заключаецца ў тым, — піша доктар Чарлз, — што грамадства, аснаванае на нажыве, не можа стварыць умоў для прыстасавання ведаў аб чалавечай прыродзе на карысць чалавеку і страціла здольнасць забяспечыць біялагічны механізм, без якога немагчыма ўзнаўленне ні адной формы чалавечага агульнажыцця».

Адзінае, дзе навуковая мысль не абмежавана — гэта ў галіне падрыхтоўкі да вайны, у вынаходніцтве новых смертаносных прылад, новых сродкаў і спосабаў знішчэння чалавецтва.

Які-ж выхад бачаць англійскія вучоныя з стварыўшагася становішча?

Хаця аўтары зборніка далёкі ад марксісцкага разумення рэчаіснасці, іх вывады ўсё-ж не пазбаўлены значнай цікавасці. Найбольш яркія мысліі ў гэтым пытанні выказвае праф. П. М. Блекет у артыкуле «Навука ў тупіку».

«Калі грамадства, — піша праф. Блекет, — не можа скарыстаць навуку, яно павінна стаць антынавуковым, а гэта значыць пакінуць надзеі на магчымы прагрэс. Гэта той шлях, які рыбірае цяпер капіталізм, і шлях гэты вядзе да фашызма. Другі шлях — поўнае соцыялістычнае планаванне ў шырокім маштабе, якое было-б планаваннем для максімальна-магчымага пашырэння вытворчасці, а не для абмежавання яе. Я пераконан, што ёсць толькі гэтыя два шляхі... Я лічу, што адзіны другі шлях — гэта шлях соцыялізма. Соцыялізму спатрэбіцца ўся навука, якую ён здолее атрымаць, каб выраблянь магчыма больш багацціяў. Вучоным асталося, бадай, нямнога часу, каб вырашыць, на чым баку яны будуць стаяць».

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ЛЯЖАЛІ Ў ШАФЕ СЕЛЬСОВЕТА

Як сельсоветы Мехаўскага раёна, так і сам райвыканком да апошняга часу стаялі ў баку ад мясапаставак, лічачы, што гэта справа толькі райупаўнаркамзага. Апарат-жа Мехаўскага райупаўнаркамзага працуе дрэнна, і ў выніку — пастаўкі мяса ідуць самацёкам. Сярод аднаасобнікаў ніякая работа не вядзецца. Больш таго, ёсць факты, калі аднаасобнікам нават не ўручалі абавязацельстваў па мясапастаўках. Так, у Мехаўскім сельсавеце абавязацельствы ўсім аднаасобнікам, у колькасці 164 гаспадарак, не былі ўручаны, а ляжалі ў шафе сельсовета аж да красавіка г. г. Не дзіўна, што з 66 проц. выканання поўгадавога плана мясапаставак па раёну, асноўная маса падае на пастаўкі калгасамі. Дастаткова сказаць, што калгасамі выканан поўгадовы план на 123 проц., а аднаасобнікамі — толькі на 11,5 проц.

У большасці выпадкаў і калгаснікам абавязацельствы ўручаліся таксама вельмі позна, што з'явілася нямалаважнай прычынай няздачы мяса восенню, калі жывёла была ўкормленая і поўнаважная.

Ёсць вельмі многа ненармальнасцей, знішчэнне якіх залежыць ад райвыканкома, але апошні да гэтага мер не прымае. У Кузьмінскім сельсавеце некалькі вёсак (Стрыжакова, Думныя, Няўбілы і інш.) яшчэ пры ліквідацыі соўгаса адыйшлі да Гарадоцкага раёна, але гэта перадача не аформлена, і Гарадку не перададзены весткі аб абавязацельствах мясапаставак у гэтых вёсках для спагнання.

Пастаноўка ўліку мясаздатчыкаў і ход паступлення мяса выклікае сур'ёзную трывогу. Есць выпадкі, калі гаспадаркі свае абавязацельствы выканалі, а іх усё яшчэ лічаць нядоімшчыкамі. Так, напрыклад, калгаснік калгаса «Другая пяцігодка», Абольскага сельсовета, Фёдар Няводнічы свае абавязацельствы за 1937 год выканаў, а да яго прышоў інспектар райупаўнаркамзага Ляўшонак апісваць маемасць. Падобныя выпадкі, на жаль,— не адзінкавы. Раённыя работнікі самі прызнаюць, што ўлік пастаўлен дрэнна, але нічога не робяць, каб палепшыць яго.

У раёне, чамусьці, няма канторы Заготжывёлы, а ёсць толькі адзін прыёмны пункт пры ст. Бычыха, падпарадкаваны Гарадоцкай канторы Заготжывёлы. Уся работа гэтага пункта даверана безадказным людзям. Жывёла ўтрымліваецца надта неахайна. Заданы корм з'ядаецца больш дужымі каровамі, а слабыя змораваюцца канчаткова. Прыёмшчык-жа жывёлы Краюшка бестурботна заяўляе:

— Я даю па норме, колькі загадана, а што каровы худзеюць — я не вінаваты.

Нядаўна быў адкрыт дадатковы прыёмачны пункт у Межы, але ён праіснаваў толькі 2 дні — 30 і 31 сакавіка — і закрыўся, не закончыўшы нават прыёмкі прыведзенай сялянамі жывёлы. А ад некаторых сельсоветаў да станцыі Бычыха звыш 50 кілометраў.

Неабходна тэрмінова адкрыць, хаця-б часова, прыёмачныя пункты ў Межы і Аболі, аб чым месяцамі хадайнічае Мехаўскі раён і ніяк не можа гэтага дабіцца.

І. КАРАНДЗЕЙ.

ДОМ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЗ... ДОМА

Поўнакроўнае, радаснае жыццё беларускага народа знаходзіць сваё яркае выражэнне ў магутным росквіце народнай творчасці і масавай мастацкай самадзейнасці. У глыбінных пунктах Палесся, у пагранічных калгасах, на лясных і тарфяных распрацоўках—усюды можна чуць гучныя песні, праслаўляючыя соцыялістычную радзіму, яе магутнасць, лепшага друга беларускага народа таварыша Сталіна. Мала такіх заводаў, калгасаў, пагранічных застаў, школ, дзе не было-б мастацкай самадзейнасці.

Па рэспубліцы налічваецца 1.758 гурткоў—тэатральных, музычных, харавых, выяўленчага мастацтва, у тым ліку 218 струнных і 75 духавых аркестраў. Квітнее і шырыцца мастацкая самадзейнасць. З асяроддзя рабочых, калгаснікаў, служачых, членаў прамысловых арцелей выяўляюцца ўсё новыя, выдатныя народныя таленты — самадзейныя мастакі, скульптары, рэзчыкі па дрэву, майстры інкрустацыі.

Гарады і вёскі Совецкай Беларусі ведаюць многа сапраўдных майстраў мастацкага ткацтва і вышыўкі, талент якіх асабліва ярка праявіўся пры вышыўцы Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну. Гэта работа заслужана прызнана шэдэўрам народнай творчасці.

Вядомы калгасны хор пагранічнай Заслаўскай МТС, выступаўшы ў Маскве, удастоіўся пахвалы таварыша Сталіна. Танцавальны калектыў гомельскага чыгуначнага клуба імя Леніна вядомы Совецкаму Саюзу як адзін з найлепшых выканаўцаў народных танцаў. Ён дэманстраваў свае дасягненні перад дэлегатамі Надзвычайнага VIII Усесаюзнага з'езда Советаў. Папулярнасцю карыстаецца хор калгаса імя Літвінава, Рэчыцкага раёна, які майстэрска выконвае старынныя народныя і сучасныя совецкія песні. Велізарны поспех опернага калектыва Горацкага сельскагаспадарчага інстытута, які паставіў оперу «Запарожац за Дунаем».

Народныя таленты на працягу раду год заціраліся трацкісцка-бухарынскімі і нацыянал-фашысцкімі бандытамі, якія ўсяляк тармазілі рост культуры беларускага народа. Але мастацкія самадзейныя калектывы, не гледзячы на ўсе намаганні ворагаў народа, растуць і шырацца з кожным днём.

Аднак, вынікі шкодніцтва на гэтым важнейшым участку ліквідуюцца вельмі марудна. У Менску ўжо больш года існуе Дом народнай творчасці БССР. Работнікі яго прарабілі немалую работу.

Але рэспубліканскія і мясцовыя арганізацыі не дапамагаюць Дому народнай творчасці стаць сапраўднай творчай арганізацыяй, сапраўдным цэнтрам мастацкай самадзейнасці БССР. Фактычна Дом народнай творчасці не мае дома, не мае больш-менш падыходзячага памяшкання для разгортвання масавай работы. Размешчаны ў адным пакоі на шостым паверсе Дома ўрада, ён хутчай нагадвае канцылярыю. У гэтым пакоі нават спакойна нельга пагаварыць з наведвальнікамі. Для праходу ў Дом урада пасля 4-х гадзін патрэбен спецыяльны пропуск. Таму ўвечары, калі рабочыя і служачыя канчаюць работу, яны не маюць магчымасці наведваць Дом народнай творчасці і атрымаць параду, дапамогу.

Трэба даць магчымасць Дому народнай творчасці БССР выканаць свае адказныя задачы. У першую чаргу трэба забяспечыць яго адпаведным памяшканнем для масавай работы.

М. КІН.

БОЛЬШ УВАГІ МАСТАКАМ-САМАВУЧКАМ

Дзве вялікія выстаўкі адбудуцца ў гэтым годзе ў Маскве. У жніўні — Усесаюзная сельскагаспадарчая і ў снежні — да дня гадавіны Сталінскай Канстытуцыі— адкрыецца выстаўка «Ленін і Сталін у народнай творчасці». Сотні самадзейных мастакоў нашай рэспублікі рыхтуюцца прыняць удзел у гэтых выстаўках, адлюстраваць у сваіх работах радаснае і шчаслівае жыццё калгаснай вёскі, паказаць вялікую любоў беларускага народа да сваіх вялікіх правадыроў — Леніна і Сталіна.

У гэтай вялікай, ганаровай і адказнай рабоце самадзейным мастакам патрэбна дапамога. Таму варта вітаць ініцыятыву Упраўлення па справах мастацтваў і Дома народнай творчасці, арганізаваўшых семінар для лепшых самадзейных мастакоў БССР, на якім займаліся 25 чалавек з Менскага, Гомельскага, Горацкага, Смалявіцкага, Асіпавіцкага, Шклоўскага і іншых раёнаў рэспублікі. З 5 па 10 красавіка яны праслухалі лекцыі на тэмы «Жыццё і дзейнасць Леніна», «Жыццё і дзейнасць Сталіна», «Работа над эскізам» і інш.

9 красавіка ва Ўпраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР адбылася сустрэча слухачоў семінара з мастакамі-прафесіяналамі і прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый. У таварыскай гутарцы самадзейныя мастакі расказалі аб сваёй творчасці, аб труднасцях у рабоце і аб тым, што яны думаюць стварыць да надыходзячых двух выставак.

Настаўнік малявання тав. Пушкін (Горкі) працуе ў галіне чэканы на медзі. Але яму вельмі цяжка прыходзіцца даставаць медзь неабходнай якасці. Ён арганізаваў у Горках студыю, але ў раённых арганізацыях холадна адносяцца да гэтага добрага пачынання і нічым не хочуць дапамагчы.

Электраманцёр рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» тав. Каўшэўны падзяліўся некаторымі творчымі пытаннямі, якія хвалююць мастакоў-самавучак. Гэта — вучоба, пашырэнне агульнапалітычнага светапогляду, правільны падыход да тэматыкі.

Асабліва адзначалася, што раённыя арганізацыі не ведаюць і не цікавяцца работай мастакоў. У Віцебску, напрыклад, расказваў тав. Сержантаў, дзе ёсць мастацкі тэхнікум і кваліфікаваныя сілы, самадзейныя мастакі не маюць ніякай дапамогі.

Малодшыя камандзіры РСЧА тт. Бураў, Літароўскі, Сергачоў, чырвонаармеец тав. Івінскі ў сваіх работах адлюструюць сілу і магутнасць Чырвонай Арміі і яе адзінства з народам. Тав. Літароўскі хоча паказаць мастака-чырвонаармейца, які малюе партрэт таварыша Сталіна.

Выступіўшыя мастак тав. Гусеў, скульптар тав. Бембель далі самадзейным мастакам рад каштоўных указанняў і абяцалі аказаць ім патрэбную дапамогу ў іх рабоце. Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Патапейка спыніўся на задачах разгортвання мастацкай самадзейнасці і заклікаў мастакоў-самавучак паказаць у сваёй творчасці дзейнасць у Беларусі саратнікаў Леніна і Сталіна—таварышоў Кагановіча, Ежова, Фрунзе, Орджанікідзе і Варашылава.

У канцы было прынята пісьмо да ўсіх самадзейных мастакоў БССР з заклікам актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і выстаўкі «Ленін і Сталін у народнай творчасці».

Н. Г.

Сотні маладых людзей з ліку студэнтаў інстытутаў, тэхнікумаў і школ падаюць заявы аб паступленні ў артылерыйскія школы. НА ЗДЫМКУ (справа налева): Л. І. Мітрафанаў, студэнт юрыдычнага інстытута і П. В. Фінскі — студэнт гідратэхнічнага тэхнікума, падае заяву аб паступленні ў ваенную школу. Побач стаяць паступаючыя ў ваенныя школы тт. Вярцінскі і Крук.
Фото Я. Салавейчыка.

МОЛАДЗЬ—У ВАЕННЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ ПАГРАНІЧНЫХ І ЎНУТРАНЫХ ВОЙСК НКВД

У лясах Карэліі і Беларусі, у пясках Туркменіі, на горных перавалах Паміра, у тайзе і на сопках Прымор'я, на берагах Ціхага акіяна пагранічнікі пільна ахоўваюць рубяжы краіны Совецкіх. Беззаветна любячы сваю справу.

Служба ў войсках НКВД — ганаровая і выключна адказная. Надзейная ахова совецкіх граніц спалучаецца з напружанай вучобай. Пагранічнік заўсёды на баявым пасту, таму тэхніка ў яго руках павінна дзейнічаць чотка і бездаказна.

Асабліва адказная роля камандзіра. Ён абавязан выхоўваць з чырвонаармейцаў свайго падраздзялення мужных, адданых справе соцыялістычнай рэвалюцыі байцоў, абучыць іх валодаць баявой тэхнікай і ўменнем распазнаваць ворага ва ўсякай лічыне.

Пагранічныя войскі выхоўваюць выдатныя кадры камандзіраў. Кузніцамі, дзе выкоўваюцца гэтыя кадры, з'яўляюцца ваенныя вучылішчы пагранічных і ўнутраных войск НКВД. Лепшыя сыны ленінскага комсамола і беспартыйныя юнакі, палітычна пісьменныя, фізічна здаровыя, культурныя, добра падрыхтаваныя адбіраюцца для абучэння ў ваенных вучылішчах пагранічных і ўнутраных войск. Да прыёму дапускаецца працоўная моладзь нашай краіны ва ўзросце ад 17 да 23 год.

Заявы аб прыёме ў ваенныя вучылішчы пагранічных і ўнутраных войск можна падаваць у ваенкаматы па месцу жыхарства, камандзірам часцей і непасрэдна начальнікам ваенных вучылішчаў войск НКВД.

РАДЫЁПЕРАДАЧА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ПРЫЁМУ Ў ВАЕННЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ

Рэдакцыяй «Апошніх вестак» Белрадыёкамітэта ўчора ўвечары была арганізавана радыёперадача, прысвечаная прыёму ў ваенныя вучылішчы.

Ля мікрафона выступіў начальнік Менскага ваеннага вучылішча імя Калініна, палкоўнік тав. Кузікаў, які гаварыў аб гераічным мінулым вучылішча, аб яго штодзённай рабоце па вырошчванню ваявых, стойкіх і адданых справе партыі Леніна—Сталіна камандзіраў РСЧА.

Курсанты гэтага-ж вучылішча Осіпаў і Луфераў расказвалі аб сваёй вучобе, аб авалодванні ваеннай тэхнікай.

З яркай, але простай прамовай выступіў студэнт Менскага гідратэхнічнага тэхнікума тав. Трызнюк.

— Праз дваццаць дзён, — гаварыў ён, — я заканчваю гідратэхнікум. Але я рашыў ваенную службу выбраць сваёй пажыццёвай прафесіяй. У мяне закончаная сярэдняя адукацыя і я рашыў паступіць у Ленінградскае ордэнаноснае артылерыйскае вучылішча.

ПРОЦІПАВЕТРАНАЯ „ТРЫВОГА"

Учора позна ўвечары ў штабе мясцовай процівапаветранай абароны. г. Менска былі атрыманы даныя аб рыхтуючымся «налёце авіяцыі». У 23 гадзіны 15 мінут загулі сірэны, папярэджваючы аб пагрозе налёту. Праз 3—5 мінут горад пагрузіўся ў цемнату, апусцелі вуліцы, спыніўся рух транспарту, прахожыя ўкрыліся ў пад'ездах дамоў.

Пагражаючае становішча было знята праз 30 мінут.

Неабходна адзначыць, што адміністрацыя завода імя Молатава, Упраўленне будаўніцтва парка культуры і адпачынку імя Горкага праявілі выключную бесклапотнасць. Тут святло не было патушана, патрабавалася ўмяшанне штаба МПВА.

ЗАКРЫЎСЯ СХОД АКТЫВА ВОДНІКАЎ

ГОМЕЛЬ. (**По тэлефону**). 10 красавіка на сходзе актыва Днепра-Дзвінскага пароходства прапаўжаліся спрэчкі па дакладу начальніка ўпраўлення пароходства тав. Барынава. Выступілі тт. Пагарэлаў (шкіпер баржы «Саратаў»), Шэйнін (упраўленне пароходства), Власаў (начальнік крычаўскіх майстэрань), Півуноў (начальнік прыстані Бабруйск), Ярмоленка (капітан парахода «Папанін») і іншыя.

З выключным уздымам актыў прыняў і паслаў прывітальную тэлеграму наркому воднага транспарту тав. Нікалаю Іванавічу Ежову, у якой абавязаўся пад сталінскім кіраўніцтвам новага наркома выйсці ў перадавыя рады.

З яркай, насычанай фактамі прамовай выступіў на сходзе член Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Волкаў.

У сваёй прамове тав. Волкаў падверг жорсткай большэвіцкай крытыцы работу Днепра-Дзвінскага пароходства і заклікаў воднікаў дастойна, па-большэвіцку правесці навігацыю 1938 года.

Пасля прыняцця рашэнняў актыў закончыў сваю работу.

ГАРЭЛІК, РОЗКІН.

ПАДРЫХТОЎКА ВЫКЛАДЧЫКАЎ РУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Для падрыхтоўкі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры для 5 і 7 класаў школ БССР у Менску, Магілеве, Гомелі, Оршы і Рагачове адкрыліся спецыяльныя шасцімесячныя курсы. На іх навучаюцца 330 чалавек, галоўным чынам, скончыўшыя сярэднія навучальныя ўстановы.

З 10 мая ў шасці гарадах рэспублікі адкрываюцца трохмесячныя курсы для падрыхтоўкі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры — на 450 чалавек — з выпускнікоў педагагічных вучылішчаў.

Па сканчэнні вучобы ўсе выпускнікі курсаў будуць накіраваны на работу ў нямоўныя сярэднія і сярэднія школы рэспублікі.

Летам у часе канікул Наркамасветы БССР арганізуе ў 13 гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі месячныя курсы на 1.000 чалавек — для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў рускай мовы ў малодшых класах пачатковых школ.

ПЕРАДСВЯТОЧНЫ ГАНДАЛЬ У МЕНСКУ

На пляцу Волі 15 красавіка арганізоўваецца вялікі перадсвяточны базар. Будуюцца тры павільёны і 8 палатак. На базары намечана прадаць на 300 тыс. руб. рознастайнага абутку, галантарэі, трыкатажных вырабаў і іншых промтавараў.

Белрыбабыт у бліжэйшыя дні завозіць у Менск 60 тон селядцоў, 22 тоны салёнай і 100 тон капчонай рыбы, 2 тоны ласасёвай ікры. Продаж каўбасных вырабаў будзе павялічан да 10 тон у дзень. Да канца месяца будзе атрымана 130 тон масла.

Пякарні Белпрамхлеба выпускаюць 20 тысяч высокаякасных тартоў, у тым ліку 8 тысяч дзіцячых (па 250 грам). Гандлюючыя арганізацыі рыхтуюць 70 тысяч падарункаў для дзяцей.

50 магазінаў горада будуць прымаць папярэднія заказы на дастаўцы на дом усіх відаў прадуктаў. Сталы папярэдніх заказаў арганізоўваюцца на заводах імя Варашылава, імя Кірава, фабрыцы «Кастрычнік» і інш.

КАЛГАСНІКІ ЕДУЦЬ НА КУРОРТЫ

ДАМАНАВІЧЫ. У першым квартале 1938 года раённы аддзел аховы здароўя накіраваў на курорты і ў санаторыі 7 калгаснікаў.

Лепшы стаханавец калгаса імя Леніна, Кацельніцкага сельсовета, тав. Старавойтаў паехаў на курорт у Есентукі, стаханаўка калгаса «Чырвоны змагар» тав. Манько накіравана ў санаторый Баркоў. шчына.

„СЛОВА АБ ПАЛКУ ІГАРАВЕ" НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Народны паэт БССР Янка Купала пераклаў на беларускую мову выдатную рускую быліну «Слова аб палку Ігараве». Кніга выйдзе з друку да 1 мая ў выданні Дзяржаўнага выдавецтва БССР. «Слова» ўключае ў сябе дрэўнерускі тэкст, паэтычны і празаічны пераклад быліны на беларускай мове.

НОВЫЯ РАБОТЫ МАСТАКА-МАЗАІСТА АРЛОВА

МАГІЛЕЎ. Вядомы мастак-мазаіст па дрэву тав. Арлоў закончыў новую работу для Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Тав. Арлоў зрабіў 6 прыгожых рам для партрэтаў і столік. Столік і рамы зроблены з набору каляровых дробных кавалкаў дрэва розных парод. Кожная рама складаецца з 10.000 кавалкаў дрэва. Мае размер 80х65 сантыметраў. Столік складаецца з 60.000 кавалкаў дрэва. Цяпер тав. Арлоў працуе над двума гербамі — Саюза ССР і Беларускай ССР, якія таксама яўляюць сабой мастацкую работу з набору каляровых кавалкаў дрэва розных парод.

ДА ПЕРШАГА МАЯ— У НОВЫЯ КВАТЭРЫ

МАГІЛЕЎ. У пасёлку шаўковай фабрыкі ў гэтым годзе заканчваецца будаўніцтва 4-павярховага дома на 88 кватэр. Каля 20 сем'яў рабочых фабрыкі атрымаюць да Першага мая новыя кватэры.

КАРЭТЫ „ХУТКАЯ ДАПАМОГА" ДЛЯ РАЕННЫХ БОЛЬНІЦ

Аўтамашыны-карэты «хуткая дапамога» атрымалі Чырвонаслабодскі, Копыльскі, Старобінскі, Асвейскі, Дрысенскі, Лельчыцкі, Даманавіцкі, Капаткевіцкі, Ельскі і іншыя аддаленыя раёны рэспублікі. Усяго завезена 32 аўтамашыны.

ЗДАРЭННІ

Спекулянты. За апошні час упраўленнем міліцыі НКВД БССР арыштаван рад спекулянтаў, прыехаўшых у г. Менск для скупкі і вывазу розных промтавараў.

7 красавіка гэтага года ўпраўленнем міліцыі затрыманы буйныя спекулянткі, прыехаўшыя з Днепрапетроўска і Омска. У спекулянтак Б. Н. Розенберг і Х. Н. Шых (жыхары Днепрапетроўска) адабрана: тры пары абутку, 43 пары рэйтуз, 33 камплекты гатовай вопраткі і трыкатажа, а таксама 1.228 руб. грошай, прызначаных для скупкі промтавараў.

У спекулянткі Е. П. Перавозенцавай (жыхарка г. Омска) адабраны купленыя для перапродажу 20 метраў мануфактуры, 15 камплектаў гатовай вопраткі і трыкатажа, 3 пары абутку і галош.

Спекулянткі арыштаваны і прыцягваюцца да судовай адказнасці.

ДЗЁННІК

— **Даклад аб міжнародным становішчы** для прапагандыстаў і агітатараў Сталінскага раёна адбудзецца 11 красавіка роўна ў 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба металістаў (вул. Кірава). Дакладчык — тав. Радзецкі. Білеты — у РК КП(б)Б.

— **Заняткі семінара прапагандыстаў** па гісторыі ВКП(б) адбудуцца 11 красавіка, у 7 гадзін вечара. Яўка прапагандыстаў абавязкова.

ДОМ ПАРТАКТЫВА.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

МЕНГОРПРОМГАНДАЛЬ

КУПЛЯЙЦЕ В МАГАЗІНАХ МЕНГОРПРОМГАНДАЛЯ
МАГ. № 3 ЛЕНІНСКАЯ, 9/2. № 22 - СОВЕЦКАЯ, 81
УНІВЕРМАГ КУЛЬТТАВАРАЎ — РОГ Совецкай і Валадарскай 29/9.

Да вясна-летняга сезону

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр
11 красавіка
Абан. № 161
ВОЧНАЯ СТАЎКА

Дзяржтэатр музкамедыі БССР (памяшк. Дзярж. Ўр. тэатра БССР)
11 красавіка
«СВАДЬБА В МАЛИНОВКЕ»
Пачатак у 8 г. 15 м.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
«ОСТРОВ СОКРОВИЩ»

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
СНАЙПЕР

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
КРЫЛАТЫ МАЛЯР

Дзіцячы гукавы кінотэатр
КАНЦЭРТ БЕТХОВЕНА

Гукавы кінотэатр «Спартак»
СКАРБ ЗАГІНУЎШАГА КАРАБЛЯ

Кінотэатр «Навіны дня»
1) Адыгея
2) «Мурман» і «Таймыр» у Мурманску
3) Журнал «Саюзкінохроніка» № 15

Асоб, маючых пратэсты да змены ніжэйпамянёнымі грамадзянамі прозвішчаў, просяць паведаміць у Менгарзагс з указаннем імя, імя па бацьку, прозвішча і месца жыхарства.

Крысаў Сяпан Трафімавіч, нараджэння 1914 г. ураджанец вёскі Юберы, Князеўскага сельсовета. Унінскага раёна. Кіраўскай вобласці, пражываючы ў гор. Менску, БССР, мяняе прозвішча КРЫСАЎ на КІ...ЛОЎ.

ТРОЦКІ Меер-Іцка Кушалевіч 1872 г., ураджанец г. Новагрудка (Польшча), пражываючы ў гор. Менску. БССР, мяняе прозвішча ТРОЦКІ на ТРАЯНОЎСКІ.

ТРОЦКАЯ Юдаіф Меер-Іцкаўна, нараджэння 1917 г., ураджэнка гор. Менска, пражываючая ў гор. Менску, БССР, мяняе прозвішча ТРОЦКАЯ на ТРАЯНОЎСКАЯ.

ТРОЦКАЯ Хая Юдэлеўна, нараджэння 1875 г., ураджэнка гор. Менска, пражываючая ў гор. Менску, БССР, мяняе прозвішча ТРОЦКАЯ на ТРАЯНОЎСКАЯ.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ па тэл. № 21-845

ГОМЕЛЬСКАМУ СКЛАДУ БЕЛВЕТСНАБЗБЫТА
ПАТРЭБЕН
ВОПЫТНЫ ФАРМАЦЭЎТ.
АПЛАТА ПА ДАГАВОРАНАСЦІ.
Звяртацца па адрасу: г. Гомель, Герасімаўская, 48, тел. 8-40.

ДА ЎВАГІ ЎСІХ ГАНДЛЮЮЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І НАСЕЛЬНІЦТВА!
Беларуская кантора ГАЛОЎКАНСЕРВА
СКУПЛЯЕ ШКЛОТАРУ—
БАНКІ і БУТЭЛЬКІ
З-ПАД КАНСЕРВАВАЙ ПРАДУКЦЫІ па фактычнаму кошту, а таксама 15-ЛІТРОВЫЯ БУТЫЛІ.
АДРАС СКЛАДА: МЕНСК, вул. Остроўскага, 4.
МАГАЗІН — Совецкая, 73.
ЛАРКІ: пляц 8 сакавіка, пас. Комінтэрн, і Лагойскі тракт.
БАЗЫ — у Гомелі і Віцебску.

РЭММАШТРЭСТУ
патрэбны
ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР І ЗАГАДЧЫК СКЛАДА.
Звяртацца: Інтэрнацыянальная, 2, тел. 28-737.

ДРУКАРНІ «ЗВЯЗДА»
патрэбны
РАБОТНІКІ ПАЖАРНА-ВАРТАВОЙ АХОВЫ, ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ, ПАДСОБНЫЯ РАБОЧЫЯ (мужчыны і жанчыны) І ВУЧНІ НА ЛІНАТЫПАХ.
Звяртацца: Менск, Совецкая, 49, 2-гі паверх, пакой № 3, з 12 да 14 гадзін.

УПРАЎЛЕННЕ СЯЦЕЙ ГОР. МЕНСКА
ПРАПАНУЕ ЎСІМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ І ЎСТАНОВАМ, ЯКІЯ НАМЯЧАЮЦЬ ЗРАБІЦЬ
ІЛЮМІНАЦЫІ ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ,
ПРАДСТАВІЦЬ не пазней 20 красавіка г. г.
У АДДЗЕЛ АБАНЕНТАЎ (Совецкая, 126) НАСТУПНЫЯ ВЕСТКІ:
1. Назва прадпрыемства і адрас.
2. Колькасць і магутнасць мяркуемых да ўключэння кропак.
3. Ці мяркуецца ўключэнне ілюмінацыі па шчотчыку ці апрача шчотчыка.
4. Дазвол на наладжванне ілюмінацыі павінен быць выбран па ўстаноўленай форме да 25 красавіка.
ІЛЮМІНАЦЫІ, УКЛЮЧАНЫЯ БЕЗ ДАЗВОЛУ, БУДУЦЬ ЗАРАЗ ЖА ВЫКЛЮЧАНЫ І ВІНОЎНЫЯ Ў ІХ УКЛЮЧЭННІ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЦІ.
ПАСЛЯ 20 КРАСАВІКА НІЯКІЯ ЗАЯЎКІ ПРЫМАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.
ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ.

ДзяржстрахСССР
У адпаведнасці з пастановай СНК Саюза ССР ад 3 лютага 1938 г. за № 111.
«АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ СТРАХАВАННІ МАЕМАСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ» ОРГАНАМІ ДЗЯРЖСТРАХА
АДКРЫТ ПРЫЁМ дабравольных СТРАХАВАННЯЎ
на выпадак стыхійных бядот маемасці ніжэйпаказаных арганізацый і ўстаноў:
1. Устаноў, якія знаходзяцца на мясцовым бюджэце і знаходзячыхся пад іх ведамам прадпрыемстваў, як-та: маемасць мясцовых советаў, дэпутатаў працоўных (апрача жылёвага фонда, які падлягае страхаванню ў абавязковым парадку), лесгасаў мясцовага значэння, аддзелаў комунальнай гаспадаркі і дабрабыту і комунальных прадпрыемстваў — электрастанцый, трамвайных паркаў, прадпрыемстваў аўтагужтранспарта, вадаправодаў і каналізацый, утыльзаводаў, лазняў, гасцініц, інтэрнатаў і т. д.
2. Соцыяльна-культурных устаноў, якія знаходзяцца на мясцовым, абласным або раённым бюджэце і гасп. разліковых арганізацый, знаходзячыхся пад ведамам устаноў, якія знаходзяцца на мясцовым бюджэце, як-та: бібліятэкі, клубы хаты-чытальні, тэхнікумы, дзіцячыя яслі, дамы калгаснікаў, тэатры, кіно, санаторыі, дамы адпачынку, паліклінікі, амбулаторыі, фізкультурныя ўстановы і т. д.
3. Прамысловых прадпрыемстваў абласнога, раённага і сельскага падпарадкавання.
4. Мясцовых, абласных і раённых гандляў.
5. Жылёва-будаўнічых кааператываў, не ліквідаваных па закону ад 17 кастрычніка 1937 г.
На страхаванне прымаецца ўсякая маемасць, належачая ўказаным вышэй установам і арганізацыям, як-та: пабудовы і інвентар, прамвінай, поўфабрыкатамі і гатовымі вырабамі, матэрыялы і тавары на складах і ў магазінах.
Страхаванне заключаецца на гадавічны тэрмін. Тавараматэрыяльныя каштоўнасці могуць страхавацца на тэрміны менш года. Пачатак адказнасці Дзяржстраха — з дня заключэння страхавання.
ЗА ЎСІМІ ДАВЕДКАМІ ПА ПЫТАННЮ ЗАКЛЮЧЭННЯ ГЭТЫХ СТРАХАВАННЯЎ НАЛЕЖЫЦЬ ЗВЯРТАЦЦА Ў ІНСПЕКЦЫЮ ДЗЯРЖСТРАХА.
УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР.

Уп. Галоўлітбела № — 5487. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 49 К., Л., Ш.